МАСТАЦКІ КІРАЎНІК «ПЕСНЯРОЎ» — ПРА СЯМ'Ю

АБ ШТО РАЗБІВАЮЦЦА ЛЮБОЎНЫЯ ЛОДКІ?

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 СТУДЗЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 10 (28877)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ЕЎДАЧЭНКА, першы намеснік міністра замежных спраў:

«Беларусь захоўвае вялікую цікавасць да ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. СГА аб'ядноўвае ўсіх асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі. У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы ў апошнія два гады мы значна актывізавалі перамоўны працэс. Мы ўжо скончылі перагаворы прыкладна з 20 гандлёвымі партнёрамі. Засталося 5—6 краін, але гэта, вядома, і найбольш складаныя партнёры. Мы запланавалі правесці ў лютым у Жэневе чарговы раўнд перагавораў, пасяджэнне рабочай групы па ўступленні Беларусі ў СГА. Часам існуе меркаванне, што гэтая арганізацыя стала непатрэбнай або неэфектыўнай. Але якраз цяпер у рамках СГА ідзе працэс аптымізацыі, рэарганізацыі, ачышчэння ад непатрэбных функцый і ў той жа час ўзмацненне наглядных функцый за выкананнем дзяржавамі-членамі сваіх абавязацельстваў».

Рамяство ў спадчыну

На фота — майстры за работай. Бацька і сын. Фёдару ХАЦКЕВІЧУ — дзевяноста два гады, Уладзіміру — шэсцьдзясят пяць. Жывуць у вёсцы Бытча Барысаўскага раёна. Па праўдзе сказаць, мне ніколі не даводзілася сустракаць старажыла, які б з такой ахвотай займаўся працаёмкай справай: у Фёдара Мікітавіча «творчы стаж» ажно семдзесят пяць гадоў! Усё жыццё ён працаваў на сельскагаспадарчай ніве — і трактарыстам, і брыгадзірам паляводча-жывёлагадоўчай брыгады. А яшчэ ўмеў будаваць хаты, сталярнічаць, бандарыць. Уменне плесці карзіны з сасновай лучыны пераняў ад роднага дзядзькі яшчэ да вайны.

— З такімі карзінамі добра ўпраўляцца на бульбе, хадзіць у грыбы і ягады, садзіць у іх гусей на яйкі, — тлумачыць майстравіты дзядуля функцыянальнасць сваіх вырабаў.

А Уладзімір Фёдаравіч — старэйшы сын Хацкевічаў — жыў у сталіцы, працаваў аўтамеханікам, а пайшоўшы на пенсію, вярнуўся з жонкай на малую радзіму, пабудаваў свой дом, даглядае бацькоў. Для яго працягваць рамесніцкую традыцыю сям'і — і павага да сваіх умелых продкаў, і захаванне тэхналогіі рэдкага пляцення, і, галоўнае, карысная праца для гаспадаркі. Хацкевічы часта дораць свае прыгожыя і даўгавечныя вырабы сябрам, суседзям, аднавяскоўцам.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КОРАТКА

- **Аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены ў Беларусі сёння, 17 студзеня, з-за ўзмацнення парывістага ветру да 15—18 м/с.**
- Беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы (ААТ «Нафтан» і Мазырскі НПЗ) у 2018 годзе перапрацавалі каля 18 млн тон нафты.
- **Гістарычнае фехтаванне са зброяй Сярэдніх вякоў увойдзе ў культурную праграму II Еўрапейскіх гульняў.**
- Традыцыю вывучэння Торы ў сінагозе адрадзілі ў Віцебску.

Сам-насам

ХОСПІС — ГЭТА НЕ БУДЫНАК. ГЭТА ФІЛАСОФІЯ

Прэміяй «За духоўнае адраджэнне» сёлета ўзнагароджаны калектыў Беларускага дзіцячага хоспіса, грамадскай арганізацыі, якая хутка адзначыць сваё 25-годдзе. З яго стваральніцай і нязменным на працягу чвэрці стагоддзя кіраўніком, энергічнай і абаяльнай Ганнай ГАРЧАКОВАЙ, мы паразмаўлялі пра тое, што сям'я з невылечна хворым малым можа быць шчаслівай, пра тое, што на самай справе патрэбна нашым дзецям і ў чым унікальнасць нашай нацыі, а таксама як варта ставіцца да жыцця і смерці.

СТАР. 4

Традыцыі малой радзімы

«СУДЖАНЫ-ЗГОДЖАНЫ, ПРЫЙДЗІ ДА МЯНЕ ПРЫБРАНЫ...»

Карэспандэнт «Звязды» даведалася, як на радзіме продкаў Арыэля Шарона ў Чавускім раёне праводзіліся святыя вечары.

На жаль, былы прэм'ер-міністр Ізраіля так і не даехаў да сваіх Галавенчыц: перашкодзіла хвароба. Але, калі б гэтая паездка адбылася, ён бы абавязкова сустрэўся з тутэйшымі захавальніцамі народных традыцый — салісткамі ўнікальнага аўтэнтычнага ансамбля з красамоўнай назвай «Незабудкі». Гурт з поспехам рэкламаваў галавенчыцкі фальклор у Беларусі і Расіі, пабываў нават у Літве і Польшчы. Мае суразмоўніцы — Надзея Данілаўна Казлова і Людміла Сцяпанаўна Каханоўская — удзельніцы калектыву з дня яго заснавання ў 1957 годзе. Яны і цяпер жанчыны завадныя. І спяюць, і станцуюць, нягледзячы на свае 80 з хвосцікам. Гэта сёння на вуліцах Галавенчыц ціха, а раней, успамінаюць сяброўкі, жыццё віравала. Асабліва весела было на Каляды. Вельмі любілі галавенчыцкія дзяўчаты паваражыць у гэты час на нарачонага. Ну каму не хочацца, асабліва ў маладосці, заглянуць у будучыню?

Забавы на «хэйдары»

Чула, што традыцыя варажыць на нарачонага прыйшла з язычніцкіх часоў. Маўляў, у разгар зімовага сезона, якраз на калядныя святы, душы памерлых прыходзілі да жывых і дапамагалі ім даведацца пра патаемнае. Бр-р, ад адных думак пра мерцвякоў мароз па скуры. Лічы, пад іконамі сядзім, на покуці, а ў галаву рознае глупства лезе.

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

Міжнароднае супрацоўніцтва

АЎСТРЫЙСКАЕ НАВАСЕЛЛЕ

Пасольства Аўстрыі ў беларускай сталіцы існуе ўжо на працягу трох гадоў, але літаральна днямі яно пераехала ў новы офіс. Там яно размясцілася пад адным дахам з эканамічным прадстаўніцтвам гэтай заходняй краіны.

Першай, традыцыйна, у новыя памяшканні запусцілі кошку. Далей **міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ** і **міністр замежных спраў Аўстрыі ў пытаннях Еўропы і інтэграцыі Карын КНАЙСЛЬ** агледзелі офіс і далі каментарыі журналістам. Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства заўважыў: «Вы ведаеце, любы пераезд для сям'і — гэта асаблівая падзея. Мне таксама прыходзілася не раз пераязджаць. Пераезд звязаны з новымі надзеямі, жаданнямі, з нейкім новым этапам у жыцці. Тое ж самае датычыцца любой установы, пасольства. Таму я вельмі рады паўдзельнічаць у гэтай цырымоніі. Я памятаю, як мы тры гады таму адкрывалі пасольства Аўстрыі ў Мінску. Думаю, што ў гэтым выпадку пераезд таксама для пасольства звязаны з нейкімі чаканнямі, з новым этапам у жыцці — у адносінах паміж нашымі дзвюма дзяржавамі. Мы, вядома ж, вельмі зацікаўлены ў развіцці шчыльных адносін з Аўстрыяй. Мы разглядаем яе як важнага партнёра ў палітычнай, эканамічнай сферы і многіх іншых галінах».

Карын Кнайсль па-філасофску адзначыла, што дыпламатыя — з'ява нябачная, у адрозненне ад яе эфекту, а таксама падкрэсліла: «Гэта пасольства — куточак Аўстрыі ў Беларусі. Гэта дом для аўстрыйцаў, беларусаў, прадпрымальнікаў, мастакоў, навукоўцаў, студэнтаў, дзяцей, якія наведвалі Аўстрыю. Калі ласка, паглядзіце на гэта пасольства як на ваш дом».

Перад гэтым паміж двума міністрамі прайшлі перамовы. Аўстрыя ўтрымлівае пазіцыі аднаго з вядучых інвестыцыйных партнёраў нашай краіны і адыгрывае важную ролю ў мадэрнізацыі шэрагу галін эканомікі.

Надзея АНІСОВІЧ.

Уладзімір ВАШЧАНКА:

Даслоўна

Без кантролю абысціся нельга

19 студзеня спаўняецца 20 гадоў органам і падраздзяленням па надзвычайных сітуацыях Беларусі. Напярэдадні Дня ратавальніка міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка акрэсліў асноўныя праблемы, якія былі ўзняты ведамствам летась.

Фота БелТА.

— Пасля таго як у гандлёвым цэнтры «Зімняя вішня», размешчаным у Кемераве, адбылася страшная трагедыя, мы пачалі па даручэнні Прэзідэнта правяраць аб'екты, дзе масава знаходзяцца людзі, — адзначыў міністр. — Нагадаю, што ў 2017 годзе на праверкі падобнага кшталту быў уведзены мараторый, якога дабіваліся шматлікія прадстаўнікі малога бізнесу. І што мы ўбачылі? Далёка не ўсе кіраўнікі добрасумленна паставіліся да таго, каб выконваць заканадаўства, скіраванае на бяспеку персаналу і ўсяго таго, што зроблена рукамі чалавека. Часцей за ўсё нашы праверкі заканчваюцца рэкамендацыямі па ліквідацыі недахопаў. Калі ж нас не разумеюць, то даводзіцца ўжываць ужо больш жорсткія захады. Сярод іх — і пастановы аб часовым спыненні эксплуатацыі памяшканняў. Так, адказных кіраўнікоў — пераважная большасць. Але без кантролю абысціся нельга.

За 2018 год колькасць пажараў у арганізацыях і на прадпрыемствах, на жаль, павялічылася. Напрыклад, у Гомельскай вобласці іх стала больш на 25 %. А на Віцебшчыне і ўвогуле адбыўся рост у 2,2 раза. А вось у Мінску лічба, наадварот, знізілася.

— Хачу асобна спыніцца на эксплуатацыі інтэрнатаў, — акцэнтаваў увагу Уладзімір Вашчанка. — Самы рэзанансны выпадак пажару ў такіх дамах адбыўся ў пачатку мінулага кастрычніка, калі ў Магілёве загінулі гаспадыня пакоя і мужчына. Гэты выпадак мы разбіралі вельмі дэтальна. Шэрагу інтэрнатаў на Міншчыне і Магілёўшчыне былі вынесены пастановы аб забароне эксплуатацыі. Прычым мушу зазначыць: калі мы ўваходзім у становішча, то работа праводзіцца вялая, неактыўная. Варта толькі прыняць жорсткія захады — і тут жа з'яўляюцца сродкі на ўсе неабходныя работы. І як гэта назваць?

Мінулае лета выдалася даволі засушлівым і спякотным. Гэта даволі істотна ўскладніла пажарную абстаноўку ў лясах.

— У гэтым кірунку мы цесна кантактуем з Міністэрствам лясной гаспадаркі, — адзначыў Уладзімір Вашчанка. — Гэта дазваляе змяняць да лепшага састарэлыя алгарытмы дзеянняў. Вось глядзіце. Раней было як: авіяцыя знаходзілася ў складзе Мінлясгаса. Калі яны выяўлялі пажар, то спачатку перадавалі інфармацыю ў свае падраздзяленні, а нас на дапамогу клікалі, калі ўжо не спраўляліся. Гэта адымала час. Зараз жа авіяцыя МНС самастойна займаецца маніторынгам. І калі мы знаходзім ачаг узгарання, то зараз жа высылаем на яго ліквідацыю свае падраздзяленні, а паралельна перадаём усе звесткі ў Мінлясгас. Свае вынікі мае і сістэма ранняга рэагавання — прадстаўнікі лясной гаспадаркі актыўна ставяць камеры відэаназірання, фотапасткі, аднаўляюць назіральныя вышкі і аператыўна расчышчаюць лясы.

Свой вопыт беларускія ратавальнікі гатовы экспартаваць за мяжу.

— Турцыя і Грэцыя ўжо зацікаўлены ў тым, каб нашы лётчыкі дапамагалі змагацца з ляснымі пажарамі. Вядуцца актыўныя перагаворы. Але дапамагаць іншым краінам будзем, не знижаючы пры гэтым стан боегатоўнасці ў сябе дома.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Соцыум

Хто з дзяцей знаходзіцца ў небяспецы?

Палажэнне аб парадку прызнання дзяцей у сацыяльна небяспечным становішчы зацверджана Пастановай Савета Міністраў ад 15 студзеня № 22. Адпаведная інфармацыя размешчана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

У прыватнасці, дакументам устаноўлены крытэрыі і паказчыкі, па якіх дзіця трапляе ў катэгорыю «сацыяльна небяспечнае становішча». Сярод іх незабеспячэнне бацькамі асноўных жыццёвых патрэб дзіцяці (калі тыя пакідаюць яго без ежы, перашкаджаюць атрымліваць абавязковую агульную базавую адукацыю (у любой форме), сістэматычна не выконваюць рэкамендацыі медработнікаў па дыягностыцы, лячэнні і (або) медыцынскай рэабілітацыі дзіцяці, што пагражае яго жыццю і здароўю і г. д.); незабеспячэнне бацькамі нагляду за паводзінамі дзіцяці і яго ладам жыцця, з прычыны чаго яно здзяйсняе правапарушэнні; амаральны лад жыцця бацькоў, злоўжыванне сваімі правамі і (або) жорсткае абыходжанне з дзіцем, у сувязі з чым ёсць небяспека для жыцця і (або) здароўя дзіцяці.

Таксама Палажэннем рэгулюецца парадак выяўлення дзяцей асобамі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, парадак правядзення сацыяльнага расследавання (вывучэнне становішча і абследаванне ўмоў жыцця і выхавання дзіцяці); парадак прыняцця рашэння аб прызнанні факту, што дзіця знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, кантроль за яго выкананнем і абскарджанне такога рашэння.

Дакумент уступае ў сілу з 1 лютага 2019 года. Рашэнні аб прызнанні дзяцей у сацыяльна небяспечным становішчы, прынятыя да ўступлення ў сілу гэтай пастановы, падлягаюць перагляду на працягу шасці месяцаў пасля ўступлення дакумента ў сілу.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

The Guardian: Брытанія аказалася на мяжы чыстца

Вялікабрытанія перажывае найбуйнейшае за 95 гадоў паражэнне ўрада. Парламент прыняў чаканае, але ад гэтага не менш драматычнае рашэнне. Палата абшчын большасцю галасоў адхіліла варыянт пагаднення аб выхадзе краіны з ЕС, які раней Тэрэза Мэй узгадніла з Бруселем. Дакумент з 585 старонак, які прадугледжвае жыццё Брытаніі і яе адносіны з Еўрасаюзам на час пераходнага перыяду і пасля Brexit, падтрымалі толькі 202 парламентарыі, супраць выказаліся 432 члены палаты абшчын.

Следам за аглушальным правалам у парламенце лідар лейбарыстаў Джэрэмі Корбін вынес на галасаванне вотум недаверу ўраду. Пазней агенцтва Reuters са спасылкай на прадстаўніка Мэй паведаміла, што сама прэм'ер падаваць у адстаўку не плануе. Кіраўнік брытанскага ўрада не першы раз за час свайго прэм'ерства аказваецца ў складанай сітуацыі і, як відаць, нават цяпер здавацца не збіраецца: яна паабяцала сканцэнтраваць намаганні на рэалізацыі выхаду Брытаніі з Еўрасаюза і апублікаваць далейшы план дзеянняў да 21 студзеня. Брытанія аказалася не проста «ў падвешаным стане, але на мяжы чыстца», піша The Guardian. Так выйшла, што краіна сама паставіла сябе ў часавыя рамкі і да 29 сакавіка мусіць выйсці з ЕС, калі ж паэтапны план дзеянняў не будзе прыняты, то Brexit пройдзе без пагаднення, што можа абярнуцца эканамічнай і сацыяльнай катастрофай. Раней паведамлялася, што больш за сто членаў Еўрапейскага парламента паабяцалі падтрымаць брытанцаў, калі тыя захочуць паўторна прагаласаваць па выхадзе з Еўрасаюза. Лёс здзелкі пад пытаннем. Брусель збірае экстранны саміт, а брытанцы запасаюцца кавай і кансервамі да ўвядзення мытных пошлін.

Макрон даў старт нацыянальным дэбатам

Аб старце грамадскай дыскусіі па галоўных пытаннях сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краіны Эмануэль Макрон напісаў у адкрытым лісце. Макрон заклікаў грамадскасць пачаць дэбаты датычна такіх тэм, як праблемы дэмакратыі, падатковай сістэмы, стану інфраструктуры і змены клімату.

Ліст змяшчае больш за 30 пунктаў, па якіх французскі прэзідэнт хоча пачаць грамадскую дыскусію. Частка з іх звязана з палітычнымі рэформамі, якія Макрон гатовы абмяркоўваць з французамі. Дэбаты ў Францыі прапануецца весці на розных грамадскіх дыскусійных пляцоўках, а таксама ў інтэрнэце. Праз месяц абмеркавання ідэй ад кожнага рэгіёна шляхам жараб'ёўкі будуць адабраныя прадстаўнікі рэгіёнаў, якія прадставяць прапановы ва ўрад. Усяго ж дэбаты будуць доўжыцца два месяцы. Адкрыты ліст Макрона з прапановай дэбатаў — гэта ўжо другая ініцыятыва прэзідэнта Францыі па дыялогу з «жоўтымі камізэлькамі». У снежні ён прапанаваў вылучыць суму ў €10 млрд на павышэнне заробкаў для нізкааплатных катэгорый работнікаў і падатковыя выплаты для пенсіянераў.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-28730 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), обшей площадью 268,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Ткацкая, 1А

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422080409101000142, площадью 0,0691 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Ткацкая, 1А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежный полос, код – 2, площадью 0,0691 га

Начальная цена продажи – 135 000 руб. (сто тридцать пять тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 13 500 руб. (тринадцать тысяч пятьсот рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 19 февраля 2019 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 13 февраля 2019 г. до 15.00

Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Наша бяспека

ПАЛОНКА — НЕ ЗАБАВА

Для акунання на Вадохрышча падрыхтавана 90 месцаў

Чакаецца, што сёлета каля 160 тысяч беларусаў акунецца ў ваду на праваслаўнае свята Вадохрышча. У сталіцы і Мінскім раёне гэта можна зрабіць у васьмі спецыяльна абсталяваных месцах — на выратавальных станцыях на вадасховішчах Крыніца, Мінскае мора (станцыі Заслаўе-1 і Заслаўе-2), Вяча, Пціч, Дразды, Камсамольскае возера, Цнянскае. Як і летась, сёлета з 19 да 20 студзеня пройдзе чэмпіянат па спартыўным зімовым плаванні, паназіраць за ўдзельнікамі якога можна з 11 да 17 гадзін.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Купанне без стрэсу

Па ўсёй краіне падрыхтавана 90 бяспечных для акунання месцаў — на 54 выратавальных станцыях і 36 выратавальных пастах. Там будуць дзяжурыць ратавальнікі Беларускага рэспубліканскага таварыства выратавання на водах (па краіне 18 і 19 студзеня іх будзе задзейнічана больш за 400), медыкі і супрацоўнікі міліцыі. Там жа будуць абсталяваны і цёплыя памяшканні, дзе можна пераапрануцца і сагрэцца.

— Ужо ўвечары 18 студзеня звычайна прыходзяць першыя ахвотныя акунуцца. Выратавальнікі кантралююць уваход і выхад з вады, які адбываецца па чарзе. Калі чалавек пачне страчваць прытомнасць, мы акажам дапамогу. У сярэднім у ваду чалавек заходзіць на 15—20 секундаў, — расказаў **старшыня Беларускага рэспубліканскага таварыства выратавання на водах Анвар ІГАМБЕРДЫЕЎ.**

Правілы падрыхтоўкі

Дзякуючы мерам бяспекі, якія прымаюцца, у апошнія пяць гадоў не было выпадкаў гібелі ці сур'ёзных траўмаў. Тым не менш медыкі папярэджваюць, што нават у абсалютна здаровага чалавека з-за спазмы каранарных артэрый сэрца можа адбыцца яго спыненне. Таму для акунання ў ледзяную ваду арганізм важна падрыхтаваць.

— Папярэдняя падрыхтоўка — гэта загартоўванне, абліванне халоднай вадой. За некалькі тыдняў да акунання важна адмовіцца ад алкаголю. Ён дрэнна ўплывае на сасуды, якія найперш пакутуюць пры знаходжанні ў халоднай вадзе, — кажа **галоўны пазаштатны камбусціёлаг Міністэрства аховы здароўя Аляксей ЧАСНОЙЦЬ.** — За некалькі гадзін да працэдуры варта добра паесці. Перад акунаннем важна размяцца, выканаць некалькі фізічных практыкаванняў. Апускацца ў ваду варта па шыю, бо пры акунанні з галавой можа адбыцца спазма сасудаў галаўнога мозга. Выходзіць з вады трэба акуратна, каб не паслізнуцца і не атрымаць траўму. Пасля хуценька выцерціся сухім ручніком, цёпла апрануцца і папіць гарачай гарбаты.

Ні ў якім разе перад акунаннем нельга ўжываць алкаголь. Ён стварае ілюзію ўяўнага цяпла, прычым на непрацяглы час, а затым адчуванне холаду толькі ўзмацняецца.

Акунанне ў палонку — працэдура для здаровых людзей. Яна не падыходзіць для тых, хто мае цяжкія хранічныя хваробы, асабліва ў стадыі абвастрэння. Не варта прымушаць рабіць яе родных і блізкіх, асабліва дзяцей і пажылых людзей: яны больш схільныя да пераахалоджвання. І памятайце, што акунацца лепш у падрыхтаваных для гэтага месцах, дзе ёсць ратавальнікі і медыкі. Ці хоць бы ў кампаніі, дзе ёсць магчымасць аказаць вам першую дапамогу.

Алена КРАВЕЦ.

Даведка

Гэтай зімой у Беларусі патанула 18 чалавек (падчас рыбалкі, хаджэння па лёдзе і інш.). Ратавальнікі папярэджваюць, што ў многіх месцах лёд нетрывалы. Калі на большасці вадасховішчаў Віцебскай вобласці ён складае 7 см і больш, што з'яўляецца бяспечным для выхаду, то ў астатніх рэгіёнах ён ненадзейны. У прыватнасці, у Брэсце на рацэ Мухавец, у Гомельскай вобласці на Дняпры і Прыпяці, на Камсамольскім возеры ў сталіцы лёд з прамыінамі, што вельмі небяспечна.

Як нас дураць

ПАД УДАРАМ — СТАРЫЯ І ХВОРЫЯ

Зламыснікі, прыдумаўшы зручныя прычыны, пранікалі ў дамы пажылых людзей і абкрадалі іх

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, шэраг падобных злачынстваў адбыўся ў студзені ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

Так, увечары 14 студзеня ў Глускі РАУС звярнулася жанчына с заявай аб знікненні 17 600 долараў, якія яна збірала на жыллё дзецям. Высветлілася, што ў вёску, дзе жыве пацярпелая, прыехалі тры жанчыны. Яны хадзілі па хатах, прыдумаўшы розныя зручныя прычыны, каб у іх трапіць. Наведалі чатыры дамы, у трох з якіх нічога не прапала. Але ў апошнім выпадку заяўніца прыгадала, што адна госця засталася на вуліцы, другая адцягвала яе ўвагу размовамі, а трэцяя хадзіла па хаце. Затым на просьбу прынесці вады гаспадыня адлучылася, а пасля яе вяртання жанчыны рэзка страцілі цікавасць да размовы і сышлі.

Паколькі прапажу пацярпелая выявіла толькі вечарам, арганізаваць аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы па гарачых слядах не ўдалося. Распачатая крымінальная справа па ч. 4 арт. 205 (крадзеж) КК РБ. Характэрныя рысы падазраваных, пра якія расказалі жыхары вёскі: адна з іх была славянскай знешнасці, у двух іншых смуглявая скура, чорныя вочы і валасы.

У Гомелі 10 студзеня дзве жанчыны пад выглядам медработнікаў пранікліў кватэру да 80-гадовай пары. Расказалі пенсіянерам гісторыю аб бясплатных медыцынскіх працэдурах. Пакуль адна госця адцягвала мужчыну размовамі, другая рабіла масаж яго невідушчай жонцы ў іншым пакоі. З якога і прапалі 1450 долараў.

У канцы мінулага года ў сталіцы і Мінскім раёне было зарэгістравана пяць заяў аб пранікненні ў жыллё пажылых грамадзян нібыта работнікаў «Мінгаза». Пасля іх візітаў зберажэнні ў людзей знікалі.

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ўстанавілі, што да злачынстваў датычныя грамадзяне Расійскай Федэрацыі 1992 і 1984 гадоў нараджэння, якія перыядычна наведваліся ў Беларусь з Разанскай вобласці. 8 снежня фігуранты былі злоўленыя з доказамі злачынства пасля крадзяжу ў Калодзішчах. Устаноўлена іх дачыненне да здзяйснення сямі аналагічных злачынстваў у сталіцы, Мінскім раёне і Віцебску, фігуранты арыштаваны і ўтрымліваюцца ў СІЗА.

Па ўсёй краіне ў невялікіх гарадах і вёсках перыядычна з'яўляюцца прадаўцы розных тавараў, якія прапануюць пажылым людзям набыць «толькі цяпер, толькі для вас з велізарнай зніжкай» коўдры, посуд, бытавую тэхніку, электраінструмент, касметыку, «цуда-мазі ад усіх хвароб». Яны прадаюць свой тавар, набыты за капейкі на аптовых рынках, пад выглядам дарагога. Пенсіянеры пападаюцца на кручок аферыстаў і аддаюць апошнія грошы за шырспажыў. Нярэдка продаж тавару з'яўляецца толькі падставай трапіць у дом і высветліць, дзе захоўваюцца грошы.

У жыллё да пенсіянераў пранікаюць пад выглядам сацработнікаў, медработнікаў, газаўшчыкоў, прадаўцоў, выпадковых людзей, якія просяць піць, есці і г. д. Складанасць раскрыцця такой катэгорыі злачынстваў у тым, што злачынцы выбіраюць у ахвяры пажылых, хворых, інвалідаў, адзінокіх, якія вельмі даверлівыя, спагадныя — але з прычыны ўзросту не могуць толкам запомніць і апісаць падазраваных.

Міністэрства ўнутраных спраў **рэкамендуе** грамадзянам выконваць некаторыя **правілы бяспекі** ў адносінах да незнаёмцаў.

- **Перш чым упусціць у жыллё чалавека, які прадстаўляецца работнікам дзяржарганізацыі, неабходна праверыць па тэлефоне інфармацыю аб накіраванні супрацоўніка.**
- **Трэба звяртаць увагу на падазроныя аўтамабілі і людзей, якія пераходзяць ад дома да дома.**
- **Калі вы заўважылі каля двара адзінокага суседа прыпаркаваны аўтамабіль, які вы ніколі раней не бачылі, варта спытаць, ці ўсё ў парадку, ці не патрабуецца дапамога.**

Сяргей КУЛАКОЎ.

Абноўлены цір прыняў першыя спаборніцтвы

Адзін з аб'ектаў II Еўрапейскіх гульняў — спартыўна-стралковы комплекс імя Цімашэнкі — аднавіў сваю работу пасля рэканструкцыі

Цяпер цір адпавядае высокім стандартам і дае магчымасць праводзіць самыя буйныя міжнародныя турніры. Падчас II Еўрапейскіх гульняў за ўзнагароды форуму тут паспрачаюцца майстры кулявой стральбы. Урачыстую цырымонію адкрыцця аб'екта наведалі афіцыйныя асобы, у тым ліку з Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Нагадаем, аб'ект, які быў узведзены ў Мінску ў 1971 годзе, размяшчаецца на праспекце Незалежнасці і носіць імя двойчы Героя Савецкага Саюза Сямёна Канстанцінавіча Цімашэнкі.

Спартыўна-стралковы комплекс выгадаваў вялікую колькасць беларускіх стралкоў, спартсменамі, якія выраслі ў гэтых сценах, заваявана больш за 30 залатых медалёў на спаборніцтвах сусветнага ўзроўню.

У дзень адкрыцця комплексу пасля рэканструкцыі стартавалі спаборніцтвы на Кубак Беларусі. У першым этапе кубкавых стартаў сезона-2019 прынялі ўдзел 185 стралкоў з розных рэгіёнаў краіны. Характэрна, што не абышлі яго сваёй увагай наймацнейшыя прадстаўнікі нацыянальнай каманды Беларусі — Віталь Бубновіч, Юрый Шчарбацэвіч, Ілья Чаргейка, Святлана Шчарбацэвіч, Марыя Мартынава і іншыя. Адзначым, што спаборніцтвы з'яўляліся адборачнымі да этапу Кубка свету, які хутка адбудзецца ў Індыі.

Нагадаем, удзельнікі спаборніцтваў па стральбе кулявой на II Еўрапейскіх гульнях у Мінску разыграюць 13 камплектаў медалёў. Пераможцам у алімпійскіх відах праграмы дастануцца квоты на летнія Алімпійскія гульні 2020 года ў Токіа. Тэставыя мерапрыемствы да мультыспартыўнага форуму-2019 пройдуць у Мінску ў маі. Плануецца, што ўдзел у іх возьмуць і замежныя стралкі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

У тэму

Фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» заключыў дагаворы аб супрацоўніцтве з трыма арганізацыямі беларускай дыяспары з Літвы і Італіі. Сваю дапамогу ў справе інфармацыйнага прасоўвання і прыцягнення ўвагі міжнароднай грамадскасці, у тым ліку беларускай дыяспары за мяжой, да II Еўрапейскіх гульняў 2019 года акажуць Беларускі культурны цэнтр «Крок» (Вісагінас, Літва), Беларуская абшчына «Крыніца» (Клайпеда, Літва) і культурная асацыяцыя «BELLARUS» (Неапаль, Італія). Подпісы пад адпаведнымі дакументамі паставілі кіраўнік «BELLARUS» Таццяна Пумпулева, кіраўнік «Крока» Алег Давідзюк, старшыня «Крыніцы» і ганаровы консул Рэспублікі Беларусь у Клайпедзе Мікалай Логвін, а таксама дырэктар Дырэкцыі Георгій Катулін.

— Удалым прыкладам супрацоўніцтва з літоўскім бокам з'яўляецца праект па арганізацыі міжнароднага Марафона дружбы Гродна — Друскінінкай. Ён атрымаў сваё развіццё, і ў выніку стаў праводзіцца велапрабег па аналагічным маршруце, які набывае ўсё большую папулярнасць. Што да ўзаемадзеяння з італьянскімі партнёрамі, то з імі ў нас склаліся цесныя сувязі з часоў падрыхтоўкі да зімовых Алімпійскіх гульняў 2006 года ў Турыне. Акрамя таго, штаб-кватэра Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў знаходзіцца ў Рыме, — звярнуў увагу ўдзельнікаў дзелавой сустрэчы Георгій Катулін. *— З дапамогай арганізацый беларускай дыяспары мы спадзяемся пашырыць дасведчанасць людзей у розных краінах аб такім праекце, як II Еўрапейскія гульні.*

Здарэнні

Небяспечнае поле, небяспечны снегаход

Падчас катання на снегаходзе загінуў жыхар горада Віцебска.

Трагедыя адбылася ў раёне вёскі Застарынне ў Бешанковіцкім раёне. Як паведамілі ва УУС Віцебскага аблвыканкама, 42-гадовы ўладальнік снегахода і яго знаёмы каталіся па заснежаным полі. У нейкі момант снегаход занесла ў меліярацыйны канал. У выніку ўдару аб руль кіроўца атрымаў сур'ёзныя траўмы і памёр на месцы. Пасажыр снегахода таксама пацярпеў, яго даставілі ў хірургічнае аддзяленне Бешанковіцкай ЦРБ.

Сяргей КУЛАКОЎ.

ХОСПІС — ГЭТА НЕ БУДЫНАК. ГЭТА ФІЛАСОФІЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ганна Георгіеўна, за ўзнагародай стаіць 25-гадовая праца ўсяго калектыву Беларускага дзіцячага хоспіса. Якія вехі ў яго развіцці вы б вылучылі?

— Першае і самае галоўнае, чаго мы дасягнулі, — стварылі каманду. І яна не распадаецца, як гэта бывае, калі нехта звальняецца, бо ёсць ядро. Па-другое, у нас ёсць свае традыцыі. За 25 гадоў мы выпрацавалі адпаведны паліятыўны падыход. Калі разглядаць паліятыў як якасць жыцця, то ў ім усяго толькі чвэрць медыцыны, і па столькі ж — сацыяльнага, псіхалагічнага і духоўнага складнікаў. Абязбольванне, парэнтэральнае харчаванне, супрацьпролежневая тэрапія і астатняе — гэта невялікая частка догляду, таму адны толькі медыкі не могуць аказаць паліятыўную дапамогу, тут павінна быць мультыпрафесійная каманда. І ў нас яна ёсць, на сёння гэта 24 супрацоўнікі плюс валанцёры.

«Трэба вучыць бацькоў быць з дзіцем — хворым ці здаровым. Ім так мала трэба — усяго толькі любіць іх...»

— Вы пабудавалі новы будынак хоспіса. Таксама пэўная вяха...

— Так, безумоўна. Гэта быў новы этап узаемадзеяння хоспіса з грамадствам. Сродкі мы збіралі па цаглінцы. Два з трох мільёнаў долараў — грошы звычайных людзей. Ёсць неймаверныя гісторыі, калі людзі дасылалі з турмы па 20 тысяч недэнамінаваных рублёў, бабулі адпраўлялі штомесяц частку пенсіі. Адзін мільён — буйныя ўкладанні, заходнія і нашага бізнесу. Так што паліятыўны центр пабудаваны ўсімі беларусамі. І гэта шыкоўны прыклад унікальнасці нашай нацыі.

«Сем'і з хворымі дзецьмі — шчаслівыя!»

— Колькі дзяцей за год праходзіць праз хоспіс?

— Склаўся стэрэатып, што хоспіс — гэта будынак, дзе змешчана нейкая колькасць хворых. Дзіцячы хоспіс і дарослы — гэта розныя рэчы. Калі дарослы хоспіс ствараўся для паміраючых, то дзіцячы — з мэтай сацыяльнай перадышкі для бацькоў. Дзіця з цяжкай працяглай хваробай прыязджае ў хоспіс, каб змяніць атмасферу і атрымаць нешта новае, і каб адпачылі бацькі. Калі ў дарослым хоспісе да 90 % анкалагічна хворых, то ў дзіцячым — усяго 15 %. Большасць дыягназаў — дзіцячы цэрэбральны параліч, міяпатыя, прыроджаныя парокі развіцця. З імі гадамі можна жыць, і размова пра тое, каб змясціць гэтых дзяцей у нейкую ўстанову, не стаіць. Ад іх рэдка адмаўляюцца бацькі, такіх дзяцей вельмі любяць. Зразумела, яны цяжка хворыя, але дзякуючы сувязі з імі жанчыны адчуваюць сваю мацярынскую значнасць. Здаровыя дзеці вырастаюць і сыходзяць ад нас і прыходзяць (ці не прыходзяць), калі ў іх ужо свае сем'і. Гэтыя ж дзеці ніколі не пакідаюць бацькоў. Распаўсюджанае меркаванне ў грамадстве: «О божа, няшчасная мама, няшчаснае дзіця!» — памылковае.

«Ідучы ад хворага, страціўшы дачку і маючы паміраючую матулю, уся ў слязах, я зразумела, што, напэўна, я шчаслівы чалавек».

— Сем'і з невылечна хворымі дзецьмі могуць быць шчаслівымі?

— Абсалютна! І нават больш шчаслівымі, чым звычайныя. Тут часам праблема ў тым, што мама настолькі паглыбляецца ў жыццё хворага дзіцяці, што не застаецца часу на здаровае дзіця, на мужа. І калі мы кажам, што тата дрэнны, то часта прычына ў маме, якая з самага пачатку не падпускае мужа да малога, робіць усё сама, а калі праз некалькі гадоў спустошваецца і стамляецца, то замяніць яе ўжо ні ў кога не атрымлівацца. Таму ў паліятыве вельмі важная работа псіхолага.

— Як у вас з'явілася ідэя стварыць дзіцячы хоспіс? З чаго ўсё пачыналася?

— Мая гісторыя пацвярджае думку, што не ўсё ў гэтым свеце залежыць ад нас. Тыя, хто мяне даўно ведаюць, здзіўляюцца, што я ўжо шмат гадоў дырэктар хоспіса. Я заўсёды была актыўная, жыццелюбівая, і ў вобраз стэрэатыпнага дырэктара хоспіса — сур'ёзнага і ў жалобным уборы — я сапраўды не ўпісваюся. Маё жыццё змянілася тады, калі я перайшла ў анкагематалагічны цэнтр. Дагэтуль я працавала навуковым супрацоўнікам у Акадэміі навук, у мяне быў стабільны добры заробак. Але я адчула, што мне надакучыла і нецікава. І калі мне прапанавалі месца нават не псіхолага, а выхавацеля ў анкагематалагічным цэнтры на мізэрную пасля маёй ранейшай зарплату, я пагадзілася. І там знайшла сябе. І сёння магу сказаць, што гэта была вельмі цікавая работа. Па адукацыі я біёлаг-хімік і працавала пасля ВНУ нейкі час у школе, выкладала і была завучам. Яшчэ там я зразумела, што ў мяне добра атрымліваецца арганізоўваць. Потым я атрымала дадатковую адукацыю і працавала ў анкацэнтры псіхолагам. Мае галоўныя настаўнікі — дзеці, яны мяне навучылі, што трэба казаць, а што нельга, навучылі чуць іх, і гэта мне дапамагло.

Летам 1994 года Вольга Вітальеўна Алейнікава (кіраўнік РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. — **Аўт.**) накіравала мяне на тры месяцы на вучобу ў Амерыку, але не ўдакладніла, у якой якасці. Я меркавала, што еду як псіхолаг, і вельмі здзівілася, калі мяне прадставілі «Доктар Гарчакова, якая будзе ствараць хоспіс». Я прамаўчала і пачала вучыцца. Усе ідэі я прывезла адтуль. Я ўдзячная маім амерыканскім настаўнікам, якія навучылі мяне тром галоўным рэчам. Па-першае, дакладна ставіць мэту — чаго ты хочаш дасягнуць. Па-другое, стварыць каманду. Па-трэцяе, каб яе затрымаць, трэба мець філасофію. І яны далі зразумець, што хоспіс — гэта не будынак. Амерыканскі хоспіс — гэта выязная каманда. Хоспісныя паслугі могуць аказвацца дома, у стацыянары, у доме састарэлых, галоўнае — гэта філасофія. Нягледзячы на тое што ў цябе цяжкая хвароба, ты найперш асоба. І калі я кантактую з табой як з асобай, я магу цябе лепш зразумець і дапамагчы. З хворым трэба размаўляць як з партнёрам.

Пасля вяртання Вольга Вітальеўна сказала: стварай. Складана гэта ўявіць, але я зарэгістравала арганізацыю за чатыры дні. Размяшчаўся хоспіс спачатку ў маім кабінеце ў анкагематалагічным цэнтры на базе 1-й гарадской бальніцы. Мая першая зарплата — 10 долараў. Першыя нашы пацыенты — пацыенты анкацэнтра. Наш першы доктар — жонка нашага анколага. А паколькі ў анкалогіі няшмат дзяцей, праз паўгода мы адчынілі свае дзверы для ўсіх.

Працаваць было не страшна, бо мы нічога не ведалі. А няма ведаў — няма і страху. Першыя веды атрымлівалі за мяжой, вучылі англійскую. Я яе вывучыла, дарэчы, за тры месяцы ў Амерыцы. Хоць у школе, ва ўніверсітэце вучыла, але па прынцыпе «здаў і забыў». Прыехала ў Вашынгтон і была ў шоку, што ніхто вакол не размаўляе па-руску. І ўсе мае веды ўсплылі ў памяці. Я актыўна размаўляла, хоць і з ляпамі. На пытанне, колькі мне гадоў, я ўсім адказавала, што мне 64, бо блытала 6 і 3. І не разумела, чаму на мяне так здзіўлена глядзяць. У сваёй развітальнай прамове замест «Я ніколі вас не забуду» я сказала «I never remember you» («Я ніколі вас не ўспамінаю»). Дагэтуль амерыканцы мне гэта прыгадваюць: «Oh, Anna who never remembers us» («Ганна, якая ніколі нас не ўспамінае»)... З часам, канешне, мы набылі неабходныя веды і вопыт.

«Мы працуем на эмпатыі, а не на сімпатыі. Мы дапамагаем, робім усё для дзіцяці, але гараваць і ўсё жыццё помніць сына ці дачку — гэта доля маці».

— Што ў вашай працы самае складанае?

— Кантактаванне з бацькамі. Мы дэкларуем, што мы сацыяльнае грамадства і ўсё вам забяспечым. Мы дэкларуем правы, забываючыся пра абавязкі. Але правы і абавязкі — два бакі аднаго медаля, як ва ўрачоў, так і ў бацькоў. Урачы не задаволены бацькамі, якія вечна скардзяцца, бацькоў раздражняюць урачы, якія іх не разумеюць. Мы працуем дзесьці пасярэдзіне і вымушаны нагадваць: так, мы вам дапаможам, але гэта ваш абавязак, а не наш. І бацькі лёгка гэта ўспрымаюць. Зараз усе рэабілітуюць дзяцей. Прычым прымяняюцца даволі жорсткія падыходы. Бацькі лічаць: нічога страшнага, чым больш балюча, тым лепш будзе ў будучым. Такая наша ментальнасць. Урачы кажуць: трэба павольна рэабілітаваць, а мама не згодна: мне трэба хутка. У нас, славян, ёсць полюсы — белае і чорнае, у еўрапейцаў, наадварот, не хапае полюсаў. Мы малюем яркімі фарбамі, а яны паўтанамі. Калі б спалучыць гэта, было б ідэальна. Адсюль наша катэгарычнасць, ацэначны падыход. І з гэтым мы змагаемся: важна, абмяркоўваючы сям'ю, не асуджаць. Бо не дай бог нам аказацца ў іх сітуацыі.

«Смерць трэба паважаць»

— Гэта складана, калі памірае дзіця, якое паспела стаць не чужым?

— Гэта здараецца не толькі сярод нашых падапечных. Гэтак жа складана мне было ў анкалогіі, там нават горш. Уявіце, прыходзіць дзіця, здаровае па ўсіх прыкметах. І толькі аналізы паказваюць, што ў яго анкалогія. Балюча яму становіцца толькі ў бальніцы, калі робяць хіміятэрапію, ад якой выпадаюць валасы, яго ванітуе. Яно звязвае боль не з хваробай, а з лячэннем. Тым не менш ты працуеш з мамай, з дзіцем. Ты пераконваеш: так, ёсць складанасці, але ты павінен прайсці праз іх — і ўсё будзе добра. Потым здаецца рэмісія, усё нядрэнна. А праз нейкі час рэцыдыў — і яно памірае. Гэта невыносна, бо я гэтаму дзіцяці абяцала, што яно здолее «выскачыць»... Я веру ў Бога. І божая справядлівасць адрозніваецца ад нашай, яна іншая. Але я дагэтуль не магу прыняць смерць дзяцей. Гэта несправядліва.

— Да якіх высноў вы прыйшлі за чвэрць стагоддзя працы ў хоспісе? Як трэба ставіцца да смерці?

— Смерць трэба паважаць, гэта частка жыцця. Ад яе не схаваешся, але і бегаць за ёй не трэба. Супрацоўнікі, калі занадта блізка да хворага дзіцяці падыходзяць, выгараюць, не могуць у нас працаваць і звальняюцца. Мы працуем на эмпатыі, а не на сімпатыі. Мы дапамагаем, робім усё для дзіцяці, але гараваць і ўсё жыццё помніць сына ці дачку — гэта доля маці. Я не забываю сваіх пацыентаў, але ведаю, што гэта мае пацыенты, а не мае дзеці. Не трэба зневажаць маці і забіраць яе ролю. У мяне самой загінула дзіця, і я не хацела б, каб хтосьці гараваў па ім так, як я. Мы ўсяго толькі побач, мы дапамагаем — да смерці і пасля смерці, калі трэба. Але гэта гора сям'і. У кожнага свой крыж: у кагосьці ўсё жыццё хварэе сын, у кагосьці ён памірае, а ў кагосьці ўвогуле няма дзяцей. Трэба вучыць бацькоў быць з дзіцем — хворым ці здаровым. Ім так мала трэба — усяго толькі любіць іх... Я ніколі не забуду, як адна мама карміла дачку, хворую на рак страўніка, экстрактам жабы. Дзяўчынка папрасіла нас пагаварыць з мамай. Але жанчына была непахісная: «Вы гарантуеце мне вылячэнне? А вось аўтар гэтай методыкі гарантуе». Мы сказалі дзяўчынцы: можам прымусіць тваю маці не даваць табе гэты сродак. Яна адказала: не трэба, калі маме так лягчэй, я буду гэта прымаць... Дзеці лепшыя за нас, яны больш чыстыя.

— Вашы веды, вопыт, увогуле работа дапамаглі, калі вы страцілі дачку?

— Складана адказаць адназначна. Я выйшла на работу адразу, супрацоўнікі ніколі не бачылі маіх слёз. Я працаголік, і з галавой сышла ў работу... Адзін выпадак дапамог мне зразумець сэнс жыцця. Пасля пахавання прайшоў дзесьці тыдзень, я пайшла на візіт да дзяўчынкі з тэтрапарэзам. Яна разумнічка, але ў яе не рухаліся ні ногі, ні рукі. І яна мне кажа: «Якая вы шчаслівая!» Я пахавала дачку, ад раку памірала мая маці, і я — шчаслівая? Спачатку я не ведала, як рэагаваць, але ўзяла сябе ў рукі і пытаю: «Чаму я шчаслівая?» — «Вы суп можаце есці лыжкай». Я была збянтэжаная. І толькі калі ішла дадому, раптам пачула, што яна хацела мне сказаць: шчасце побач з намі. Мы нават не разумеем гэтага! Калі ядзім суп, бяром лыжку, падносім — робім гэта аўтаматычна. Гэта і ёсць шчасце. І так вось, ідучы ад хворага, страціўшы дачку і маючы паміраючую матулю, уся ў слязах, я зразумела, што, напэўна, я шчаслівы чалавек.

Мой арганізм адрэагаваў на стрэс аўтаімунацірэідытам, я працяглы час лячылася. На працягу года я не прымала, не верыла ў смерць дачкі. Ёсць відэафільм, дзе яна здымалася незадоўга да трагедыі, я яго так і не змагла паглядзець. І ніколі не паглядзіць. У кожнага з нас свой спосаб абароны. Гэтак жа, як і гаруе кожны па-свойму. Норма ў гараванні адна — калі табе дрэнна. Ведаеце, што адчувае матуля, у якой некалькі гадоў таму памерла дзіця? Яна па ім сумуе. І ўсё жыццё я буду сумаваць. Добра ці дрэнна плакаць? Прайшло 22 гады пасля смерці дачкі, але я і зараз часам плачу. Ніколі не адзначаю дзень смерці, толькі дзень нараджэння. Напэўна, я не змірылася дагэтуль...

Мяне выратаваў швейцарскі псіхолаг адным практыкаваннем. Выцягваеш наперад руку, а на тваёй далоні — скрыначка, у ёй — фотаздымкі, першыя малюнкі, валасы твайго дзіцяці. Усё, што памятаеш, пакладзі туды. Потым марудна-марудна адводзь руку ўбок да той пары, пакуль табе стане камфортна. (У пэўны момант я зразумела, што больш не магу адводзіць, бо я павінна гэта бачыць.) І глядзі наперад... Вось так і жывеш: глядзіш наперад, у будучыню, але пры жаданні ёсць магчымасць вярнуцца да ўспамінаў. Потым гэты тэст мы праводзілі з нашымі жанчынамі, якія страцілі дзяцей, ён заўсёды дзейнічае. Матулям часам здаецца, што, жывучы, яны зневажаюць памяць дзіцяці. Гэта не так: памяць заўсёды з вамі, але яна не загароджвае будучыню.

— Што вас натхняе на працу? У чым крыніца сіл?

— Напэўна, у тым, што я навучылася цаніць кожны дзень. Вось сёння з'явілася сонца — выдатна, дагэтуль было неба, зацягнутае хмарамі — таксама нядрэнна. Расплюшчваеш раніцай вочы, глядзіш у акно — гэта ўжо шчасце. Я з задавальненнем пачынаю кожную раніцу, спяшаюся на работу. Жыць мне цікава і не сумна, маркотна толькі тады, калі няма працы.

Алена КРАВЕЦ.

Сямейная газета

Выпуск № 1 (116)

Пра карысць неспакою

Помніце дыялог бацькоў з мультфільма пра самастойнага хлопчыка дзядзьку Фёдара? «Трэба, каб у доме і сабакі былі, і кошкі, і прыяцеляў цэлы мех, і ўсякія там жмуркі-хованкі... Вось тады дзеці і не стануць прападаць», — даводзіў тата. — «Тады бацькі прападаць пачнуць!» — адрэзала мама. Літаральна ў дзвюх-трох фразах — сутнасць глабальнага канфлікту інтарэсаў розных пакаленняў.

Быць дзіцем, асабліва маленькім, насамрэч цяжка. Бо нармальнае здаровае дзіця, па трапным выразе знакамітага доктара Камароўскага, худое і актыўнае, з шылам самі ведаеце дзе. Яно прагне бегаць, скакаць, усё хапаць, спасцігаць свет з тысячай розных «чаму» і «як». А мы вучым спачатку хадзіць і гаварыць, а потым — сядзець і маўчаць. І часта патрабуем несумяшчальных рэчаў: так, ты займайся — і спортам, і музыкай, і верш на памяць, і англійскую паўтары, але не ўслых і не тут. Бо тата працуе, мама стамілася, у дзядулі галава баліць. Так што, калі ласка, пагуляй у іншым месцы, пасядзі хвіліначку ціха, не замінай, хоць трошкі памаўчы — а на думку суседзяў, лепш і плач бязгучна, і рухайся бясшумна.

Вы бачылі на свае вочы такіх міфічных персанажаў? Наўрад ці. Ціхія і зручныя для навакольных яны тады, калі «сядзяць» у гаджэтах — а гэта не проста не выйсце, а крыніца новых праблем у стасунках бацькоў і дзяцей. Альбо калі задумваюць ці ўжо здзяйсняюць якое-небудзь свавольства. Зноў жа, чаго далёка хадзіць: у нас у кватэры раптоўная цішыня абазначае, што малодшае цішком лезе ў камп'ютар «глядзець фатаграфіі» (тры секунды на здзяйсненне), трыбушыць татаву ці маміну рабочую сумку або торбы з пакупкамі (15—20 секундаў на навядзенне творчага беспарадку і мастацкай інсталяцыі на падлозе ці стале), падставіла крэсла і лезе да чаго-небудзь строга забароненага і крохкага (пяць секундаў на рэалізацыю, маштаб разбурэнняў непрадказальны). Таму, як толькі наступае гэта страшнае імгненне цішыні, трэба падхоплівацца, бегчы, забіраць недазволенае, пераключаць увагу і прапаноўваць штосьці больш захапляльнае.

З цягам часу прыходжу да высновы, што цішыня — злосны вораг бацькоў. Калі дзіця зусім маленькае, устаеш пасярод ночы ад пранізлівай цішыні: ці дыхае? Калі падрастае, то працяглая паўза — верны знак учыненай шкоды або зацішку перад бурай. Калі зусім дарослае і самастойнае, гадаеш, калі наступіць абазначанае ў СМС «хутка буду», і прыслухоўваешся, ці не звіняць ключы.

Натуральна, ад штодзённага шуму і мітусні стамляешся, і часам патрэбны спакой і адпачынак. Але на вечны, пагадзіцеся, заўжды паспеем. Тым больш калі перад вачыма шмат жывых прыкладаў ціхай, самотнай адзіноты, якая паглынае, забірае здароўе і дабаўляе гадоў не старым яшчэ людзям — нікому не пажадаеш...

Таму — не трэба, не абсякайце іх штохвіліны, патрабуючы цішыні. Пакіньце дзецям права быць дзецьмі — шумнымі, гарэзлівымі, якім цалкам неабходна і пасмяяцца, і пабегаць, і пагуляць у не самыя ціхія гульні, пакуль не сядзе ўнутраная батарэйка (мая бабуля называла гэты стан «сярэдзіна поўная, краёчкі іграюць»). Канешне, шумець трэба без фанатызму, аніякіх там начных караоке і футбольных матчаў на ламінаце — усё ж выхаванне і павагу да правоў іншых людзей ніхто не адмяняў. Але, па вялікім рахунку, калі дом шуміць, звініць, гудзе — значыць, ён жыве, і ў вас усе дома.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Тыя, хто побач

Раман КОЗЫРАЎ:

«СЯМ'Я ТРЫМАЕЦЦА НА ПЛЯЧАХ ЖОНКІ»

Мастацкі кіраўнік «Песняроў» разам з жонкай у шчырым інтэрв'ю расказаў пра радасці і складанасці сямейнага жыцця

Здаецца, гэта было зусім нядаўна: падчас канцэрта прыхільнікі павіншавалі Рамана Козырава з нараджэннем двайнят. З таго часу прайшло дзесяць гадоў, і ён заўсёды з пяшчотай гаварыў пра сваіх дзяцей і жонку. Але толькі цяпер мужчына рашыўся расказаць пра няпросты дыягназ хлопчыкаў: як яго прыняць, як жыць, як не перакладаць свае праблемы на плечы іншых людзей.

— Раскажыце пра знаёмства з будучай жонкай.

Раман: — На Аксану ўпершыню звярнуў увагу падчас экзамену нашай агульнай знаёмай ва ўніверсітэце культуры. Аксана — харэограф, і вось менавіта ў танцы я яе і ўбачыў. Да таго ж яна вельмі прыгожая жанчына, і не заўважыць гэта было немагчыма. Мы тады пазнаёміліся, але сябраваць пачалі крыху пазней. І я, і Аксана з'ехалі працаваць па кантракце ў адну з усходніх краін. Падчас гэтай камандзіроўкі мы прыглядаліся адно да аднаго, а сустракацца пачалі ўжо ў Мінску.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

ДВОЕ — ГЭТА ЗАНАДТА?

Аб што ў нас разбіваюцца любоўныя лодкі

Сям'я — сярод галоўных каштоўнасцяў беларусаў. Разам з тым, у краіне штогод распадаецца кожны другі шлюб. Чаму мы не можам зберагчы самае дарагое і якія наступствы маюць кожныя няўдалыя адносіны?

У ПОШУКАХ ВІНАВАТЫХ

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Святлана БУРАВА пачала вывучаць тэму распаду беларускіх сем'яў яшчэ напрыканцы 70-х.

— Тады жанчыны адважваліся на развод з-за таго, што «муж п'е і б'е». Здрада і ўмяшальніцтва ў сямейныя справы трэціх асоб таксама былі распаўсюджанай прычынай, каб сысці. На другім месцы — прэтэнзіі матэрыяльнага характару: нізкія даходы, дрэннае жыллё, беспрацоўе аднаго з сужэнцаў. Трэцяя група прычын уключала сексуальную дысгармонію, бясплоднасць, фізічныя захворванні.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

З усёй душой

«Кармлю іх, мыю, пераапранаю, магу на ручках патрымаць...»

Чаму Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа наймае сацыяльных няняў для дзяцей-сірот

У сярэднім у кожнай дзіцячай абласной клінічнай бальніцы на лячэнні штомесяц знаходзіцца па 10—15 дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, ва ўзросце ад некалькіх месяцаў і да 10 гадоў. Дактары і медсёстры абследуюць такіх дзетак, бяруць у іх аналізы, лечаць. Але ніхто з імі не гуляе, не бярэ іх на рукі, не размаўляе... У медсясцёр на гэта проста няма часу, а няня, якая займалася б з дзецьмі-сіротамі, у штатным раскладзе нашых бальніц не прадугледжана...

«Шкада было гэтых малютак да слёз!»

Сітуацыя крыху змянілася, калі ў Беларускім таварыстве Чырвонага Крыжа вырашылі запусціць праект «Няня замест мамы». Мая суразмоўніца Вольга Грыцкевіч у рамках гэтага праекта з ліпеня мінулага года працуе сацыяльнай няняй у Гомельскай дзіцячай абласной клінічнай бальніцы — у аддзяленні, дзе ляжаць дзеткі да двух гадоў, якія засталіся без апекі бацькоў.

Вользе Грыцкевіч 58 гадоў. Кажа, што да пенсіі працавала ў аддзеле кадраў у будаўнічай арганізацыі. «Раней няньчыла дарослых, а цяпер перайшла на дзяцей, — смяецца яна. — З дзецьмі лягчэй. А вось дарослыя будаўнікі, ведаеце, і на работу могуць не выйсці, і запіць... І з усімі трэба было аддзелу кадраў разбірацца».

— Ёсць сем'і, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, бацькі часцей за ўсё п'юць, — тлумачыць Вольга Іванаўна. — І калі дзеці ў такіх сем'ях недагледжаныя — галодныя і халодныя, брудныя, — сацработнікі іх з сям'і забіраюць. Малых змяшчаюць у бальніцу, дзе дактары іх абследуюць. А потым мы чакаем рашэння суда: што з імі рабіць далей. Некаторым бацькам даюць шанц выправіцца і аддаюць дзяцей назад у сям'ю, але гэта адзінкавыя выпадкі. Часцей за ўсё дзетак адпраўляюць у дом малюткі.

Сацыяльная няня расказвае, што бачыла малых, якія нават не рэагавалі на сваіх бацькоў, калі тыя прыходзілі іх наведаць. «У нас быў хлопчык, яму было паўтара года, і ён не хацеў ісці да мамы, плакаў, — кажа Вольга Грыцкевіч. — Ён да мяне больш ішоў, таму што прывык ужо. Я ж тут кожны дзень з паловы дзявятай і да пяці. Кармлю іх, мыю, пераапранаю, магу на ручках патрымаць, прылашчыць — дзіцяці, асабліва хвораму, такая ўвага проста неабходна. Гэта і выздараўленню спрыяе... Маленькаму дзіцяці як паветра патрэбна цяпло, ласка, і яго не падманеш: калі ты да яго добра ставішся — тады і яно да цябе з усёй душой. Гэта цяпер мае дзеці! У аддзяленні так і кажуць: дзеці Вольгі Іванаўны *(смяецца)*. Вось у мяне зараз дзевяць дзяцей. Самай маленькай — пяць месяцаў»...

Вольга Іванаўна прызнаецца, што на работу зараз ідзе з вялікім задавальненнем, бо ведае, што яе чакаюць маленькія выхаванцы. Хоць так было не заўсёды. «Я спачатку наогул думала, што не змагу тут працаваць, — успамінае яна. — Шкада было гэтых малютак да слёз! І часам я абуралася нават, калі ў некаторыя сем'і дзяцей вярталі, лічыла, што гэтыя бацькі не заслугоўваюць такога шанцу. Вы б іх бачылі, якімі яны сюды прыходзілі: счарнелыя ад п'янак, дрыжачыя! Прыносілі даведку, што закадзіраваліся, але гэта часта было толькі да атрымання дзіцячай дапамогі. Таму ў нас былі выпадкі, калі дзеткі паступалі сюды зноў...»

У 2017 годзе грамадскасць сабрала сродкі на зарплату 18 сацыяльным няням

Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа працуе над праектам, які дапамагае знайсці няняў для дзяцей без бацькоў у бальніцах краіны, з 2016 года. У бальніцы любое дзіця перажывае моцны стрэс з-за таго, што яно ў незнаёмым месцы, вакол — незнаёмыя людзі, і заўсёды трэба быць гатовым да ўкола ці яшчэ нейкай балючай працэдуры. Але часцяком простай чалавечай цеплыні і ласкі бывае дастаткова, каб дзіця адчула сябе лепш. Медыкі нават адзначаюць, што ў малых, якіх гладзяць і носяць на руках, хутчэй праходзяць прастуды і іншыя захворванні!

Цесны кантакт з маці ці нават з любым іншым клапатлівым дарослым — пытанне эмацыянальнай бяспекі для любога дзіцяці. Таму Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа і вырашыла наняць такіх сацыяльных няняў. Па задумцы няні павінны былі стаць людзьмі, якія дораць малым свой клопат, пераапранаюць, кормяць, водзяць на працэдуры, а яшчэ — бяруць на рукі, гуляюць, чытаюць казкі...

Наогул, першая сацыяльная няня, якая даглядала малых-сірот, з'явілася ў дзіцячай бальніцы Гродна ў 2015 годзе. А ў 2017-м грамадскасць сабрала сродкі на зарплату ўжо 18 сацыяльных няняў у 16 бальніцах Мінска, Гомельскай, Гродзенскай, Брэсцкай і Мінскай абласцей.

Праект «Няня замест мамы» працягваецца, кажуць у БТЧК. Пры падтрымцы грамадскасці сацыяльныя няні, якія будуць даглядаць дзяцей-сірот, у найбліжэйшы час з'явяцца ў бальніцах ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Святлана БУСЬКО.

Прававая гасцёўня

Каб атрымаць адтэрміноўку ад прызыву

Трэба мець дзіця, бацькоў-пенсіянераў ці быць дэпутатам

Паўтара года назад мы з жонкай пабраліся шлюбам, абодва ўпершыню. Нядаўна нашай дачцэ споўніўся год, а ў мяне скончылася адтэрміноўка ад службы ў арміі ў сувязі са станам здароўя. Ці маю я права цяпер не пайсці ў войска з прычыны нараджэння дачкі і на які час? Мае бацькі, дарэчы, пенсіянеры, аднак у іх, акрамя мяне, ёсць яшчэ паўналетнія сын і дачка. Ці магу я атрымаць адтэрміноўку як кармілец сваіх родных?

Л. Г., *г. Мінск*

На пытанне адказвае **Дар'я ГРЫЦКЕВІЧ, галоўны спецыяліст упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Падставы, па якіх даецца адтэрміноўка ад прызыву грамадзян на ваенную службу, службу ў рэзерве, вызначаны артыкулам 32 Закона Рэспублікі Беларусь ад 5 лістапада 1992 года «Аб воінскім абавязку і воінскай службе» (далей — Закон). Для вас прычынай адтэрміноўкі будзе з'яўляцца ўтрыманне жонкі і дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Пры гэтым тэрмін дзеяння адтэрміноўкі скончыцца, калі малой споўніцца тры гады.

Адтэрміноўкай ад прызыву ў армію, згодна з Законам, могуць стаць наступныя прычыны:

па стане здароўя;

для працягу адукацыі;

для праходжання інтэрнатуры і здачы кваліфікацыйнага экзамену па спецыяльнасці інтэрнатуры;

па сямейным становішчы;

для атрымання ваенна-тэхнічных спецыяльнасцяў;

у сувязі з ажыццяўленнем дэпутацкіх паўнамоцтваў;

на падставе ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Заканадаўствам вызначана, што адтэрміноўка ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, па сямейным становішчы даецца грамадзяніну, які мае:

жонку падчас цяжарнасці — пры наяўнасці пацвярджальных дакументаў;

жонку і дзіця ва ўзросце да трох гадоў;

двух дзяцей;

непрацаздольных бацькоў або іншых членаў сям'і, якія адчуваюць патрэбу па стане здароўя ў адпаведнасці з заключэннем урачэбна-кансультацыйнай (рэабілітацыйнай экспертнай) камісіі ў чужым пастаянным доглядзе, і не знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні.

Апошні пункт мае сілу як падстава для адтэрміноўкі ад арміі, калі ў непрацаздольных старых адсутнічаюць іншыя працаздольныя асобы, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі і абавязаны ў адпаведнасці з заканадаўствам краіны ўтрымліваць названых членаў сям'і і клапаціцца пра іх незалежна ад таго, пражываюць яны разам або асобна. Або калі працаздольныя асобы ёсць, аднак яны праходзяць тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, альтэрнатыўную службу.

У вашым выпадку тое, што вы клапоціцеся пра двух непрацаздольных бацькоў, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, не можа стаць безумоўнай прычынай для адтэрміноўкі па сямейным становішчы. Нават калі ўрачэбна-кансультацыйная (рэабілітацыйная экспертная) камісія прыме рашэнне аб іх патрэбнасці ў пастаянным чужым доглядзе і яны не знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, вы маеце паўналетніх брата і сястру, якія таксама абавязаны ўтрымліваць непрацаздольных членаў сям'і, дасягнуўшых пенсійнага ўзросту.

Звяртаю вашу ўвагу, што рашэнне аб прадастаўленні адтэрміноўкі ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, прымаецца раённай (гарадской) прызыўной камісіяй.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых установ мы будзем шукаць на іх адказы.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ПОЛЕСЬЕ»

Наименование объектов

Лот № 1.

1. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-30976 (наименование – блок вспомогательных помещений, часть 1; назначение – здание специализированное иного назначения), площадью 4256,8 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159Д.

Составные части и принадлежности: пристройка из блоков газосиликатных, двухэтажная кирпичная пристройка, металлический навес, водопроводная сеть, линия электропередачи, выпуск канализационной сети, асфальтобетонное покрытие, восемь ограждений металлических.

2. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-39323 (наименование – склад цемента с площадкой; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 284,6 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159Д/2.

Составные части и принадлежности: площадка из ж/б плит, линия электропередачи.

3. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-41158 (наименование – здание конюшни; назначение – здание специализированное животноводства), площадью 310,0 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159Д/3.

Составные части и принадлежности: пристройка из кирпича и панелей, воздушная линия электропередачи.

4. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-39706 (наименование – здание овощехранилища с навесом; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 887,2 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159Д/4.

Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, железобетонный подвал и навес, водопроводная сеть, тепловая сеть, линия электропередачи, выпуск канализационной сети.

5. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46910 (наименование – склад для запчастей ремонтно-механического цеха; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 84,4 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159Д/6.

6. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-39585 (наименование – склад трикотажных изделий; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 368,5 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159Д/5.

Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка склад, водопроводная сеть, тепловая сеть, линия электропередачи.

7. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-41154 (наименование – навес для хранения кип угаров; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 119,5 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159Д/1.

Составные части и принадлежности: линия электропередачи.

8. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-39705 (наименование – гараж с пристройкой; назначение – здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 1104,1 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159Д/7.

Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, навес, водопроводная сеть, тепловая сеть, линия электропередачи, выпуск канализационной сети, асфальтобетонное покрытие, три металлических ограждения.

9. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-47834 (наименование – ливневая сеть № 1; назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 77,4 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159, ливневая сеть № 1.

10. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-47833 (наименование – ливневая сеть № 2; назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 496,5 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159, ливневая сеть № 2.

11. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-47842 (наименование – канализационная сеть № 1; назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 40,2 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159, канализационная сеть № 1.

12. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-47835 (наименование – канализационная сеть № 8; назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 31,0 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159, канализационная сеть № 8.

13. Многолетние насаждения в количестве 27 ед. (в т. ч. 21 ед. – деревья, 6 ед. – кустарники).

Объекты недвижимости расположены на земельном участке с кадастровым номером 14450000000900033, площадью 3,0854 га (имущественные права на земельный участок, право аренды)

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**1 889 324,92**	**Размер задатка, руб.**	**188 932,49**

ЛОТ № 2.

Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-60346 (наименование – распределительно-трансформаторная подстанция; назначение – помещение неустановленного назначения), площадью 146,0 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 159Ж-2

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**176 154,12**	**Размер задатка, руб.**	**17 615,41**

ЛОТ № 3.

Паропровод котельная «Западная», протяженностью 4 850,0 п. м, инвентарный номер 481636, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Пинск

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**292 000,00**	**Размер задатка, руб.**	**29 200,00**

Организатор торгов	РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Условия продажи	Без условий
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10 BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245

Аукцион состоится 20 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10 – 325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам: 8 (0162) 20-92-13 ; 21-88-81, 8 029 626 72 52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329

в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 19 февраля 2019 г. до 17.00

Антикризисный управляющий индивидуальный предприниматель Шило Алексей Сергеевич объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества торгово-производственного унитарного предприятия «Торговый дом «СКИФ» (дата торгов: 04.02.2019 в 10.00), имущества общества с ограниченной ответственностью «Сфера-СК» (дата торгов: 04.02.2019 в 11:00).

Место проведения торгов: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. 8 (029) 3360872.

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещены в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: http://bankrot.gov.by.

УНП 191720323

ДВОЕ — ГЭТА ЗАНАДТА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

У 2008-м сацыёлаг працавала над вялікім нацыянальным даследаваннем — «Прычыны сямейнага няшчасця ў Беларусі».

— Галоўная прычына разладу цяпер — грошы і матэрыяльныя каштоўнасці. Незадаволенасць узнікае, таму што адзін з партнёраў, на думку іншага, не ўмее зарабляць ці траціць, не імкнецца да большага і г. д. Далей ідуць праблемы, якія датычацца ўзаемаразумення ў сям'і. Людзі паводзяць сябе эгаістычна, не слухаюць партнёра, не дапамагаюць яму. Прэтэнзіі наконт дзяцей у асноўным выказваюць жанчыны: бацька часам увогуле не прымае ніякага ўдзелу ў выхаванні. Акрамя таго, у сувязі з разбурэннем гендарных стэрэатыпаў, падзел хатніх абавязкаў таксама можа стаць прычынай пастаянных сварак. Жанчына больш не хоча ў адзіночку цягнуць на сабе работу, дом, дзяцей і мужа. П'янства, наркаманія і іншыя дрэнныя звычкі па-ранейшаму застаюцца ў спісе, — кажа Святлана. — А «несумяшчальнасць характараў», якая так часта называецца прычынай разводаў, не бывае ў прынцыпе. Кажуць, калі выпадковых мужчыну і жанчыну пасяліць на бязлюдным востраве, яны ў любым выпадку паміж сабой дамовяцца і будуць жыць у згодзе.

Значыць, у нашых умовах гэта таксама магчыма. Іншая справа, чым большы выбар, тым складаней выбраць. Менавіта ў мегапалісах самы вялікі працэнт людзей-адзіночак.

Разам з тым навукоўцы акцэнтуюць увагу на размежаванні ўнутраных прычын і знешніх фактараў, якія прыводзяць да разводаў.

— Сацыяльныя ўмовы таксама не ідэальныя для трываласці шлюбаў. Напрыклад, інтэнсіўнае зацягванне жанчын у прафесійную і вытворчую дзейнасць выгадна дзяржаве і сям'і ў эканамічным плане, але не спрыяе дэмаграфічнай сітуацыі. Работа — асноўны «канкурэнт» сям'і. Менавіта эканамічна незалежныя жанчыны, калі яны не задаволеныя стасункамі, часцей патрабуюць скасавання шлюбу, — кажа Святлана. — Сама працэдура разводу ў наш час максімальна спрошчаная. Да таго ж цяпер у грамадстве ліберальнае стаўленне да тых, хто развёўся. Помню 60-я гады, калі распад сям'і ўспрымаўся як трагедыя, як ганьба. Ніхто гэтым не ганарыўся — наадварот. А сёння з гэтага робяць сенсацыю, на якой можна зарабіць паболей грошай. Менавіта падрабязнасці разводаў артыстаў, палітыкаў і спартсменаў у прэсе і на тэлебачанні робяць рэйтынгі і «збіраюць касу». Такая абстаноўка толькі падштурхоўвае да неабдуманых дзеянняў. Калі ты кожны дзень бачыш такое, бясконцую чараду шлюбаў і разводаў, то і сам мімаволі пачнеш думаць: «Ім можна, а мне нельга? І я развядуся, знайду кагосьці лепей». Дзе добрыя прыклады? Іх сапраўды не хапае.

Даследаванні жыццёвых каштоўнасцяў беларусаў паказваюць: сям'я ў нас на першым месцы. Так было заўсёды. Але цяпер у гэтае паняцце ўкладваецца зусім іншы сэнс, чым 50 гадоў таму. Само паняцце сям'і стала размытым. Раней з сям'ёй звязвалі пачуццё любові і павагі, падтрымку, сумеснае вядзенне побыту, нараджэнне дзяцей. Цяпер гэта проста кола блізкіх людзей, нават не абавязкова кроўных сваякоў.

— Праблем падкідвае і віртуальная рэальнасць, якая зацягвае людзей усё больш, асабліва моладзь. Раней «у грамадства» мы выходзілі ўсёй сям'ёй. Муж, жонка і дзеці ўспрымаліся неадрыўна. Зараз мы ператвараемся ў індывідуалістаў: не хочам быць добрымі для мужа і дзяцей, нам важна, колькі «лайкаў» паставяць незнаёмцы пад фота ў «Фэйсбуку» ці «Інстаграме».

> Па статыстыцы часцей за ўсё сем'і распадаюцца ў першыя пяць гадоў. Сутыкнуўшыся з першымі цяжкасцямі, людзі адступаюць. Мяркуюць: калі ў самым пачатку праблемы, то і далей яны будуць працягвацца. Але гэта не так.

— Любыя адносіны можна ўявіць як графік з крывой. Даследаванні паказваюць: у самым пачатку, калі паміж людзьмі адбываецца фізічнае прыцягненне і росквіт эмоцый, лінія знаходзіцца ўверсе. З цягам часу, калі ўзнікаюць так званая «бытавуха» і шэрыя будні, яна апускаецца ўніз. Ёсць дно, якога можна дасягнуць у момант крызісных сітуацый — нараджэнне дзіцяці, смерць блізкіх, хвароба. Калі людзі разам перажываюць гэтыя падзеі, то становяцца па-сапраўднаму роднымі. Пасля гэтага, як правіла, назіраецца ўздым. Задавальненне ад адносін на новым узроўні яшчэ большае, чым напачатку, паколькі цяпер партнёры дасягнулі глыбейшага паразумення з розных бакоў. У доўгія адносіны трэба ўкладвацца для таго, каб быць шчаслівым не толькі зараз, але і праз 20, 30, 50 гадоў.

НАВУКА СТВАРЭННЯ

— Калі мы хочам выхаваць пакаленне з трывалымі поглядамі на сям'ю, то працаваць над гэтым трэба сістэмна, пачынаючы са школы, — упэўнена сацыёлаг. — Цяперашняе маладое пакаленне, якое падыходзіць да ўзросту ўступлення ў шлюб, звычайна не ведае толкам, як трэба будаваць адносіны. Пік разводаў у нас якраз прыйшоўся на канец 90-х — пачатак 2000-х. Сённяшнія хлопцы і дзяўчаты ўспрымаюць развод як норму. Натуральна, што яны не бачаць сэнсу ўкладвацца ў доўгатэрміновыя адносіны — у многіх перад вачыма прыклад бацькоўскіх няўдач.

Кожны год Святлана Бурава прапаноўвае сваім студэнтам напісаць эсэ на тэму «Гісторыя кахання, якая мяне ўразіла». Умова — расказаць пра рэальна існуючую пару. «Прыкладаў з жыцця ўсё менш. У лепшым выпадку, пішуць пра сваіх бабуль і дзядуль, а менш пра бацькоў», — сумна канстатуе жанчына.

Аднак, на яе думку, выхад з сітуацыі ёсць. Напрыканцы 80-х у беларускіх школах пачалі ўводзіць прадмет «Этыка і псіхалогія сямейнага жыцця».

— Нам неабходна вярнуцца да гэтай ідэі. Цяпер, калі інфармацыйнае поле такое шырокае, мы ведаем «усё пра ўсіх». А як будаваць адносіны з тымі, хто побач, не ведаем. Пазітыўную ўстаноўку на сям'ю трэба закладваць да таго, як чалавек паспее нарабіць памылак, — у школе. Каб, уступаючы ў дарослае жыццё, кожны ведаў, навошта ўкладвацца ў трывалыя адносіны, якія спакусы яго падсцерагаюць на шляху да шчаслівай сям'і і як іх пазбегнуць. Гэта не менш важна, чым зрабіць удалую кар'еру.

ПЕРАД СУДОМ — ДА ПСІХОЛАГА

Калі зазірнуць на адзін з самых папулярных беларускіх форумаў, то ў раздзеле пра разводы можна ўбачыць толькі тры тэмы — «як прымусіць былога мужа плаціць аліменты», «як пазбегнуць выплаты аліментаў» і «як адсудзіць маёмасць/што рабіць з ільготным крэдытам, калі разводзішся/дайце кантакты юрыста па шлюбаразводных працэсах». Пра тое, як захаваць сям'ю, дзе знайсці ў сабе сілы, каб жыць далей, і як не адбіць у дзяцей жаданне жаніцца, гаворка не ідзе. А між іншым у сталіцы працуе Мінскі гарадскі цэнтр сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей. Па бясплатную псіхалагічную кансультацыю сюды могуць звярнуцца ў тым ліку і пары, у якіх наспеў крызіс сямейных адносінаў.

— Стасункі зводзяцца выключна да назапашвання крыўд, крыку, нежадання ісці на ўступкі. Людзі не могуць выйсці з канфлікту цывілізаванымі метадамі. Пэўны час яны церпяць, а пасля або звяртаюцца да псіхолага, або адразу падаюць заяву на развод, — кажа **загадчык аддзялення псіхалагічнай дапамогі сем'ям і дзецям Наталля ПАЧЭПКА.** — Адкуль такая непрымальнасць да іншых? Мы ўсе неўсвядомлена пераносім бацькоўскую мадэль пабудовы адносін на сябе. Калі маці пастаянна крычала на бацьку, то вялікая верагоднасць, што і дачка будзе «піліць» свайго мужа. Аднак, калі ў сям'і партнёра былі зусім іншыя парадкі, мірыцца з такімі паводзінамі ён не стане.

Па словах псіхолага, канфлікт — гэта норма жыцця.

— Медыятары лічаць, што спрэчак не бывае толькі на могілках, і гэта сапраўды так. Увесь свет — гэта сутыкненне супрацьлеглых поглядаў, мэт, інтарэсаў. Таму нагод для канфліктаў шмат, асабліва ў сям'і. Праўда, да з'яўлення дзяцей яны лёгкія, пасля папаўнення — абстаноўка абвастраецца. Сем'і, дзе партнёры гатовыя да работы над сабой і ідуць на кампрамісы, спраўляюцца з усім самастойна. Такіх у наш час мала. Адсюль і вынікае такі вялікі працэнт разводаў.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Прыходзяць на кансультацыі парамі, разам з дзецьмі. Бывае, жанчыны спрабуюць разабрацца ў сямейных праблемах без прысутнасці мужа. Хоць мужчыны таксама не рэдкія госці ў цэнтры. І ўсё ж часцей незадаволеныя адносінамі менавіта прадстаўніцы слабога полу.

Вечная жаночая прэтэнзія «пакахала аднаго чалавека, а пасля вяселля яго быццам падмянілі» разбіраецца псіхолагамі цэнтра пастаянна:

— Калі мы выбіраем партнёра, то прымяняем у дачыненні да яго адны крытэрыі. Ці правільней сказаць, што па першым часе мы даём волю эмоцыям і фізічнаму прыцягненню, не прыслухоўваемся да розуму і на многае заплюшчваем вочы. Першыя некалькі гадоў сумеснага жыцця ў сям'і адбываюцца натуральныя прыціркі. Ідэальны вобраз з нашай галавы дапаўняюць рысы рэальнага чалавека, якім з'яўляецца наш партнёр. Калі ў гэты перыяд пара знойдзе ў сабе сілы пагаварыць і прыйсці да кансэнсусу, то шлюб выйдзе на новы ўзровень. Не — яны разбягуцца ў пошуках новых «ідэалаў», — тлумачыць Наталля. — Наступнае выпрабаванне — нараджэнне дзяцей. Жанчыне цяпер мала таго, што мужчына прыгожы і моцны, ёй трэба, каб ён быў і добрым бацькам. А гэтых якасцяў у яго можа проста не аказацца. Аднымі крыкамі «чаму ты мне не дапамагаеш?» праблему не вырашыць, зноў патрэбны канструктыўны дыялог.

Яшчэ адна тыповая сітуацыя, якую даводзіцца разбіраць: людзі доўга жывуць у канфліктах і «пужаюць» адно аднаго разводам.

— Для іх гэтае слова — магчымасць дасягнуць сваёй мэты. «Калі не знойдзеш новую работу, я з табой развядуся» ці «Калі не перастанеш сябраваць з Пецем, сыду да мамы». Замест таго, каб сесці і спакойна абмеркаваць праблему, сужэнцам прасцей кідацца фразамі пра развод.

Асобна можна разглядаць канфлікты, якія ўзнікаюць у маладых з бацькамі сужэнца. Вядома, усе мамы і таты жадаюць сваім дзецям толькі лепшага, але часта ў гэтым імкненні дапамагчы яны заходзяць занадта далёка.

— Важна з самага пачатку ставіць кропкі над «і», выбудоўваючы сямейныя межы. Шматлікія канфлікты ўзнікаюць, калі ў пары нараджаецца дзіця і навaспечаныя бабулі і дзядулі пачынаюць занадта апякаць немаўля. Але па законе адказнасць за жыццё і здароўе дзіцяці нясуць бацькі. Калі яны звернуцца да старэйшых па параду, тыя павінны падказаць. Не — няма чаго ўмешвацца. Бабулі і дзядулі патрэбны, каб песціць унукаў, а для выхавання ёсць мама і тата.

Увогуле, многія не могуць справіцца з сумесным выхаваннем дзяцей. Аднойчы ў цэнтр прыйшла шматдзетная пара. Траіх выгадавалі без праблем, а вось чацвёртае дзіця стала камнем спатыкнення. Здавалася б, дарослыя людзі з вялікім вопытам, якія разам праз многае прайшлі. Але здалі нервы, яны стаміліся і перасталі «чуць» адно аднаго.

Таксама дзеці часта бываюць не толькі прычынай, але і ахвярай бацькоўскіх канфліктаў.

— Калі сужэнцы «ваююць» між сабой, яны або не звяртаюць увагі на дзетак зусім, або выкарыстоўваюць іх як зброю: «Я забяру» і «Я адсуджу». Гэтым самым нярэдка даводзяць маленькіх да неўрозаў ці нават больш сур'ёзных псіхічных захворванняў.

Як бачна, праблемы ў сем'ях бываюць рознымі. Чым можа дапамагчы псіхолаг, па сутнасці чужы чалавек?

— Спецыялісты не даюць гатовых формул шчаслівых адносін, не раяць дзейнічаць тым ці іншым чынам. Сакрэт у тым, што кожны можа сам знайсці рашэнне. Задача кваліфікаваных псіхолагаў — задаць правільныя пытанні, — тлумачыць Наталля. — Калі сварацца двое, ніхто не хоча ставіць сябе на месца іншага. Яны даказваюць сваю «праўду» да хрыпаты і кажуць, што «так рабіць нельга», але вынік гэтых «высвятленняў» адносін нулявы. Куды эфектыўней стварыць сітуацыю, у якой людзі ўбачаць сябе збоку і самі зробяць пэўныя высновы.

Ганна КУРАК.

ЗЯМНЫЯ РУЖЫ

— Як мне надакучылі людзі! — усклікнула Яна.

— І я часам не хачу на іх глядзець! — адказаў Ён.

— Я хацела б збегчы куды-небудзь далёка-далёка, у іншы свет, дзе няма людзей. І каб у нас, як у Маленькага Прынца, была ўласная планета, — прамовіла Яна.

— І што б мы з табой на ёй рабілі?

— Ты пасадзіў бы ружы, а як вырастуць, прыносіў бы іх кожную раніцу мне ў ложак і прызнаваўся б у каханні, — прадоўжыла Яна.

— Прыгожая мара, — пагадзіўся Ён. — А што, калі і мы надакучым аднойчы адно аднаму?

— Гэтага не здарыцца, бо там у нас не будзе іншага выбару, — растлумачыла Яна.

— Але ж у чалавека павінен быць выбар! — адказаў Ён.

— Не заўсёды, — запярэчыла Яна. — Мы ж не выбіраем, напрыклад, дзе нарадзіцца...

— Але тады мы ўсяго гэтага больш не ўбачым! — паказаў Ён на акно.

— Атрымліваецца, што так, — адказала Яна.

— Дык, можа, пакуль нікуды не паляцім? — перапытаў Ён.

— Тады замкнём дзверы, адключым тэлевізар, тэлефон і інтэрнэт, — Яна ўлюбёна зірнула каханаму ў вочы. — А заўтра раніцай ты падорыш мне ружы, няхай і зямныя...

— Згодны, — адказаў Ён. — Толькі... Давай, не сёння.

— Чаму? — здзівілася Яна.

— Сёння якраз гуляе «Дынама». А яшчэ трэба зрабіць некалькі важных званкоў, зайсці ў «Фэйсбук», ды і сябар абяцаў завітаць.

— А як жа мы? — ледзь чутна спытала Яна, але Ён ужо адчыняў дзверы.

І толькі ў вечаровым небе ледзь бачным блакітным агеньчыкам свяцілася паміж мільярдаў зорак іх маленькая планета.

Аляксандр БЫКАЎ.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

НЕБЯСПЕЧНЫЯ ГУЛЬНІ,

ці На што трэба звярнуць увагу бацькам падлеткаў

Днямі суд Першамайскага раёна Мінска абвясціў прысуд удзельнікам вечарынкі, падчас якой 19-гадовая дзяўчына загінула ад ужывання псіхатропу. Моладзі ад 17 да 20 гадоў, студэнтам і абітурыентам, якія толькі паступілі ва ўніверсітэт у мінулым годзе, але так і не змаглі прыступіць да заняткаў, прад'яўлена абвінавачванне за незаконны абарот наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Гэта гучная справа ўзрушыла не толькі бацькоў, але і ўсё грамадства. Як здараецца, што маладыя людзі аказваюцца на лаве падсудных нечакана для саміх сябе і сваіх блізкіх? На што звярнуць увагу бацькам, каб уберагчы сваіх дзяцей ад праблем з законам, і як інспектары працуюць з сучаснай моладдзю, расказаў намеснік начальніка аддзела прафілактыкі УАПП ГУУС Мінгарвыканкама Яўген АБРАМОВІЧ.

— Нягледзячы на век інфарматызацыі, дзеці ў сілу ўзросту і невялікага досведу не разумеюць небяспечнасць «гульні» з наркотыкамі. Нават разумныя падлеткі, якія добра вучацца, трапляюць у вельмі складаныя сітуацыі з-за небяспечных рэчываў. Адны становяцца залежнымі ці гінуць, іншыя — атрымліваюць тэрміны пазбаўлення волі. Я аналізую затрыманні непаўналетніх і бачу на лаве падсудных моладзь ад 14 гадоў. Наркадзялкі ведаюць, што за распаўсюджанне наркотыкаў даюць вялікія тэрміны зняволення, таму ўцягваюць у свае справы непаўналетніх. Часцей за ўсё дзеці «пападаюцца», калі робяць так званыя «закладкі» наркотыкаў. Помню хлопца, які ўладкаваўся на работу кур'ерам за 1000 долараў у месяц, каб больш не прасіць у маці грошы. У асабістай перапісцы яго паведамілі, што канкрэтна ён будзе дастаўляць. Ён асмеліўся не адразу, але спакуса аказалася вялікай, маўляў, зараблю на тэлефон і красоўкі — і ўсё. Але папаўся. Бацькі ж былі ўпэўнены, што іх дзіця проста малайчына, ганарыліся, што ўладкаваўся на работу... Здаецца, мы робім усё, каб данесці школьнікам інфармацыю аб тым, якую небяспеку тоіць у сабе ўжыванне і распаўсюджанне наркотыкаў. Праводзім лекцыі ў школах, гімназіях, каледжах, расказваем і тлумачым, але, на жаль, размовы не на ўсіх уплываюць.

— Якія яшчэ правапарушэнні распаўсюджаныя сярод падлеткаў?

— На самай справе вельмі розныя. Аднак часцей за ўсё затрымліваем дзяцей за распіццё спіртных напояў. Прычына банальная — жаданне пакаштаваць алкаголь. Прычым гэта ніяк не звязана з тым, у якой сям'і выхоўваецца падлетак. Паспрабаваць забароненае — уласцівасць пераходнага ўзросту. Яшчэ дзеці могуць пахуліганіць, напрыклад, сметніцы пераскідваць ці пашкодзіць транспартныя прыпынкі. Гэта такая бравада з боку падлетка, спроба заявіць аб сабе грамадству, калектыву...

Але хачу адзначыць, што сучасныя дзеці сістэмна не ўжываюць наркотыкі, у большасці сваёй не п'юць і не хуліганяць. Здараюцца гучныя справы, але гэта хутчэй выключэнне, чым правіла. Помню, на маёй адказнасці быў падлетак, які свядома выбраў крымінальны шлях: маўляў, буду крымінальным аўтарытэтам. І тлумачылі яму, што гэта не так, як у фільмах, якіх ён нагледзеўся... Але хлопец на той момант, на жаль, ужо страціў давер да дарослых і таму аказаўся ў спецустанове.

— Якім чынам дзеці трапляюць у спецустанову?

— У нас як бывае? Падлетак напіўся ці скраў нешта ў краме. Разумее — гэта дрэнна і яго павінны пакараць. Яго і сапраўды выклікаюць на камісію. Ён чакае, баіцца. А камісія што робіць? Стараецца высветліць прычыну такіх паводзін, каб дапамагчы. Пагаварылі, паўшчувалі на камісіі і ўсё. На аднаго і сапраўды размова паўплывае, на іншага — не. Вось у апошніх зноў здараюцца парушэнні. Спецустанова — гэта як паказчык таго, што за правапарушэнне ў нашай дзяржаве рана ці позна прыйдзецца несці адказнасць. Калі на дзіця не ўздзейнічаюць ні размовы, ні іншыя мерапрыемствы, якія праводзяць інспектары ІСН, то мы такіх накіроўваем ва ўстанову закрытага тыпу. Гэта яшчэ не турма, а ўстанова адукацыі. Там знаходзяцца падлеткі з усёй краіны, яны жывуць пад назіраннем педагогаў і псіхолагаў круглыя суткі. Канешне, ёсць абмежаванне ў зносінах з сябрамі і бацькамі. Звычайна наступны крок пасля гэтага — турма. Але часцей за ўсё дзеці, пабываўшы ў такой установе, стараюцца туды не вяртацца.

— Ужо прайшло больш за год, як унеслі папраўкі ў закон «Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнаглядзнасці і правапарушэнняў непаўналетніх». Ці былі яны на карысць?

— Так. Па-першае сёння стала значна менш дзяцей, з якімі неабходна праводзіць работу. Раней у нас не было ўзроставага абмежавання і тэрмінаў знаходжання на ўліку падлеткаў, якія здзейснілі правапарушэнні. Цяпер усё інакш. Мы можам праводзіць работу з дзецьмі, якім ужо ёсць 11 гадоў. Бо самі разумееце, што ў 7—10 гадоў дзіця яшчэ не можа асэнсаваць што дрэнна, а што добра. Але з 11 гадоў, мы лічым, да малых ужо можна прымаць меры выхаваўчага характару, напрыклад, накіраванне ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову закрытага тыпу. Аднак адзінаццацігадовых у нас мала. Цяпер супрацоўнікі інспекцыі і адукацыі могуць удзяляць няпростым дзецям больш увагі, чым раней. Па-другое, людзі сталі прывыкаць да таго, што мы ўжо не ставім падлеткаў на ўлік. У нас проста існуюць дзеці, з якімі праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа. Бацькі і самі дзеці пачалі ставіцца да нашай работы больш спакойна. Калі дзіця не парушае закон, то звычайна праз год работа з ім спыняецца. Праўда, калі яно асуджана, то знаходзіцца пад нашым назіраннем, пакуль не скончыцца выкананне прыгавору суда.

— Што вы маеце на ўвазе, калі гаворыце, што праводзіце работу з падлеткамі?

— Мы нашых падапечных далучаем да ўдзелу ў розных мерапрыемствах. Наведваем дзяцей дома і па месцы вучобы: адных — раз у месяц, іншых — кожны тыдзень. Супрацоўнік міліцыі сам выбірае форму работы, зыходзячы з асабістых характарыстык падлетка. У жыцці розныя сітуацыі бываюць... Часта малым проста не хапае мужчынскай увагі, а інспектар можа растлумачыць нешта падлетку і неяк скарэктаваць паводзіны. Інспектары, калі ёсць неабходнасць, таксама кантралююць працэсы навучання... І калі ёсць праблемы, разам з педагогамі, псіхолагамі стараюцца знайсці прычыну, напрыклад, чаму малады чалавек не робіць дамашняе заданне ці прапускае заняткі. У такіх выпадках дзіця бачыць, што яго кантралююць, з ім размаўляюць, расказваюць аб наступствах яго паводзін. Разумееце, перспектыва трапіць у спецыяльную ўстанову ці турму нікога не вабіць. Праўда, гэта толькі адзін з утрымліваючых фактараў для дзіцяці. Нашай задачай больш бачу выявіць прычыну недапушчальных паводзін.

«Часцей за ўсё затрымліваем дзяцей за распіццё спіртных напояў. Прычына банальная — жаданне пакаштаваць алкаголь. Прычым гэта ніяк не звязана з тым, у якой сям'і выхоўваецца падлетак».

— Вы гаварылі, што інспекцыя праводзіць мерапрыемствы...

— Так. Мы стараемся арганізаваць вольны час дзяцей. Праводзім розныя спартыўныя турніры па футболе, хакеі, валейболе... Летам у нас праходзіць маштабнае мерапрыемства пад назвай «Лета — пара актыўная!», калі мы разам з дзецьмі наведваем музеі, аквапаркі, заапаркі, кінатэатры... Падчас гэтай акцыі ў нашым горадзе адзначаецца зніжэнне падлеткавай злачыннасці. Таксама прапануем дзецям падчас канікул патрыятычныя летнікі, якія працуюць ўжо не першы год. Сталі актыўна супрацоўнічаць з БРСМ, напрыклад, летась яны праводзілі для нашых дзяцей лазартаг, а таксама турніры па футболе і тэнісе. Вядома, разам з малымі гулялі і нашы інспектары. Такія мерапрыемствы аб'ядноўваюць, паміж інспектарам і падапечным узнікае давер. Гэта важна ў нашай рабоце.

Увогуле стараемся заняць вольны час кожнага падапечнага з улікам яго інтарэсаў. А то ў нас як бывае — мама сказала, напрыклад — «Хадзі на бісер», — і ўсё! Ну, не хоча гэтае дзіця хадзіць «на бісер». Часта асноўнай праблемай «цяжкага падлетка» з'яўляецца яго незанятасць. Такіх мы накіроўваем, напрыклад, у Цэнтры, дружалюбным падлеткам, ды ўвогуле варыянтаў шмат. Калі ў падлетка з'яўляецца зацікаўленасць ў чымсьці, то праблемы вырашаюцца самі сабой.

— Іншымі словамі, вы робіце тое, з чым не справіліся бацькі?

— Я сказаў бы, што дапамагаем бацькам накіраваць дзіця ў патрэбнае рэчышча. Калі збіраецца камісія, кожны суб'ект прафілактыкі, а гэта педагогі розных узроўняў, псіхолагі і іншыя спецыялісты — прапаноўваць свае рэсурсы. З розных прычын не заўсёды бацькі могуць арганізаваць вольны час дзецям. Бывае, проста не дазваляюць фінансы, адсутнасць бабулі ці дзядулі, якія могуць кантраляваць дзяцей, — і падлетак застаецца адзін, без інтарэсаў і неабходнага догляду.

Увогуле, няма аднолькавых падлеткаў. Яны ўсе розныя. Індывідуумы. Дастукацца да іх, знайсці той самы ключык, схіліць да сябе, выклікаць давер — гэта і ёсць праца інспектара. Заўсёды трэба маніторыць дзіця. Што яму цікава, чым займаецца... Старонка ў сацыяльных сетках шмат што гаворыць аб падлетку. І нашы інспектары ўсё гэта вывучаюць, каб «выцягнуць» дзіця, знайсці яго інтарэсам законнае выйсце.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

— Што трэба рабіць бацькам, каб іх дзіця не аказалася сярод праблемных?

— Не трэба пускаць выхаванне на самацёк, нельга спадзявацца толькі на школу: маўляў, там растлумачаць, што добра, а што дрэнна. Я ўсё разумею, трэба зарабляць грошы, стаміліся, няма часу... Але неабходна шукаць выйсце. Знаходзіць дзецям заняткі па інтарэсах і размаўляць! Бо калі гэта не будуць рабіць бацькі, то прыйдзецца падключацца нам, інспектарам. І добра, калі размовы будзе дастаткова, добра, калі гэта размова здарыцца яшчэ да таго, як падлетак апынецца на лаве падсудных.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 401/С-33527 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – кафе «Визит»), общей площадью 1410,10 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422050400002002738, площадью 0,2690 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кафе), расположенный по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадью 0,2690 га

Начальная цена продажи – 384 000 руб. (триста восемьдесят четыре тысячи рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 38 400 руб. (тридцать восемь тысяч четыреста рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 19 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 13 февраля 2019 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

«СЯМ'Я ТРЫМАЕЦЦА НА ПЛЯЧАХ ЖОНКІ»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Колькі часу прайшло вось ад гэтага букетна-цукерачнага перыяду да вяселля? І ці быў у вас вопыт сумеснага жыцця да рэгістрацыі шлюбу?

Раман: — Ад знаёмства да вяселля прайшло чатыры гады. А, так бы мовіць, «рэпетыцыі» не было, бо мы ўвесь час у раз'ездах. Я лічу, што мужчына можа заводзіць сям'ю, калі ў яго ўжо ёсць сваё жыллё або выразная перспектыва, калі яно з'явіцца. Уласна, рашэнне пайсці ў загс было абумоўлена тым, што нам хацелася знаходзіцца разам, нягледзячы на гастролі. Да таго часу я купіў кватэру, так што не ўзнікала пытання, куды прывесці жонку.

— Аксана, а як вы ўспрынялі тую акалічнасць, што выходзіце замуж за артыста «Песняроў», што прадугледжвае наяўнасць паклонніц?

Аксана: — Дрэнна, калі ў артыста няма паклонніц. Трэба размяжоўваць тых, каму цікавая творчасць, і дзяўчат, якія «палююць» на артыстаў як на «статусных кавалераў». Я сама творчы чалавек, таму добра разумею гэта. Не думаю пра дрэннае, бо хочацца давяраць і жыць спакойна, тварыць, развівацца і радавацца жыццю.

— Раман, а вы былі знаёмыя з сям'ёй Аксаны да вяселля?

Раман: — Так, мая і Аксаніна бацькоўскія сем'і падобныя. Для нас гэта прыклад, як трэба жыць. Упэўнены: гэта вельмі важна, што мы выхаваны ў падобных традыцыях, на адных каштоўнасцях. Не скажу, што мы на сто працэнтаў зможам гэтак жа жыць, усё ж такі іншы час, але зараз мы глядзім на нашых бацькоў і думаем пра тое, што праз 20—30 гадоў хацелі б гэтак жа ставіцца адно да аднаго, да сваіх дзяцей і ўнукаў.

— Усе казкі заканчваюцца вяселлем. У жыцці ж самае цікавае пачынаецца пасля яго: тут і пытанні пра грошы ўсплываюць, і пра тое, хто будзе мыць посуд. Вы абмяркоўвалі гэтыя тэмы да таго, як пабраліся шлюбам?

Раман: — Не, я прытрымліваюся такой класічнай мадэлі: калі мы сям'я, значыць, у нас усё агульнае, і мы заўсёды разам. Гэта тое, што я бачыў у сваёй сям'і. Я не хацеў бы пачынаць сямейнае жыццё са складання шлюбнага кантракта.

«Інтэграваныя класы я лічу добрай практыкай. Яны даюць магчымасць асаблівым дзецям сацыялізавацца. З іншага боку, нават хуліганістыя хлопцы пачынаюць адчуваць адказнасць за тых, хто слабейшы».

Аксана: — Мы былі маладыя, шчаслівыя, усё было як у ружовых акулярах: прыгожа, радасна, з песнямі і танцамі. Бытавыя пытанні не ўзнікалі і не стаялі на першым плане. Мы дзяліліся творчымі ідэямі, разам нам было вельмі камфортна.

— А ўсё ж такі, як вы плануеце сямейны бюджэт?

Раман: — У прыярытэце ў нас — выдаткі на дзяцей, на іх здароўе, развіццё. Абсалютна ўсё роўна, якой фірмы на мне адзенне. Нават калі б не было такіх абставін, мы не гналіся б за самым вялікім тэлевізарам і апошняй мадэллю халадзільніка. На мой погляд, і машына павінна быць бяспечнай і адпавядаць патрэбам сям'і, а не прэстыжнай маркі і моднага колеру. З бацькоўскай сям'і я вынес такі досвед: у жыцці заўсёды ёсць нейкі прыярытэт. Бацькі, два маіх браты — усе музыкі. У нас магло не быць новых джынсаў, але інструменты былі найлепшыя на той час, як і педагогі, — і тут, і ў Маскве. Зараз цэнтр нашага жыцця — дзеці.

— Іх у вас трое ...

Раман: — Мы доўга чакалі дзяцей. Нашы першынцы — двайняты Стас і Глеб нарадзіліся раней тэрміну, і, як следства, маюць рухальныя праблемы. Першыя тры месяцы жыцця хлапчукі правялі ў рэанімацыі. Потым ім рабілі аперацыі. Увесь гэты час яны праходзяць курсы рэабілітацыі ва ўмовах медустаноў. Кожны дзень ім неабходныя масаж, ЛФК і шмат усяго іншага. Вось на гэта і выдаткоўваюцца грошы. Бязмежна захапляюся Аксанай, таму што сям'я трымаецца на яе плячах. Калі я ў

Уладзімір Мулявін-малодшы, Алег Жалезнякоў, Аксана і Раман Козыравы, Марына Мулявіна, Сяргей Шкурдзе.

Мінску, вядома ж, дапамагаю. Мы аб'ездзілі рэабілітацыйныя цэнтры ў Беларусі, Украіне, Расіі, Польшчы. Усе імкнуцца трапіць у брэсцкі рэабілітацыйны цэнтр «Тонус» — там не толькі выдатныя спецыялісты, тэхніка, але і ўмовы. А вось у Мінску цэнтр на Валадарскага месціцца ў старым будынку — такі ж ліфт, сталовая ў калідоры ... Дзецям цяжка пераадольваць паверхі, бацькі вымушаныя насіць іх на руках, каб усюды паспець.

— Раман, у «Песнярах» даволі доўга вы былі музычным кіраўніком, як пры такой сямейнай нагрузцы рашыліся на пасаду мастацкага кіраўніка-дырэктара?

Раман: — Вячаслаў Шарапаў пасля 15 гадоў працы сышоў нечакана. Ён, напэўна, стаміўся. Зараз яго разумею і здзіўлены, як ён столькі пратрымаўся, бо гэта неймаверная нагрузка. У першую чаргу — псіхалагічная, вялікая адказнасць за людзей. Міністэрства культуры да канца не верыла, што ён сыдзе, таму за дзень да заканчэння яго кантракта, калі стала зразумела, што ён не жартуе, сабралі сход. І ўжо калектыў вырашыў, што кіраваць далей буду я, хоць і адмаўляўся. Мяне літаральна ўгаварылі на сходзе. Галавой я разумеў, што ўжо «ў тэме» і ведаю нашы праблемныя пытанні ў калектыве, але ў той жа час усведамляў, што цяпер гэтаму давядзецца прысвячаць усяго сябе. Таму былі сумненні. Са Славам мы працавалі ў тандэме, таму ён прасіў Міністэрства культуры ўлічыць меркаванне калектыву і яго асабістую рэкамендацыю. Мы да гэтага часу падтрымліваем сяброўскія адносіны. Як старэйшы калега, ён дапамагае парадамі, за што я ўдзячны яму.

— Аксана, а вы сумуеце па працы?

Аксана: — Вядома. Спадзяюся, што калі-небудзь вярнуся. А пакуль працую мамай і жонкай. І харэографам таксама — са сваімі дзецьмі. Калі тата на гастролях, мы любім зладзіць танцавальна-музычны вечар. Танцуем, куляемся, спяваем, іграем на музычных інструментах. Гэта разрадка для ўсіх — і вялікіх, і маленькіх.

— Як вы рашыліся на трэцяе дзіця?

Аксана: — Я вельмі хацела яшчэ адно дзіця. Гэта вымаленае дзіцятка, якое вельмі чакалі мы і нашы родныя. Наша Віялета — гэта сонейка для нас усіх. Хлопчыкі яе вельмі любяць. Яны робяць ёй камплименты, захапляюцца яе танцамі, кажуць, што яна — наша радасць. У нас ёсць яшчэ вельмі разумная котка Шурка, яна — наш псіхолаг і выхавальнік, дапамагае разраджаць абстаноўку.

Раман: — Для мяне дзяўчынка — гэта нейкі неверагодны космас! У нас у сям'і былі толькі мужчыны, таму мае бацькі і я вельмі шчаслівыя. Аксаніны родныя, вядома, таксама рады ўнучцы.

— Розніца паміж вашымі дзецьмі восем гадоў. Як рыхтавалі Стаса і Глеба да з'яўлення сястрычкі?

Аксана: — Для іх не было сюрпрызам нараджэнне Віялеты. Мы ім расказвалі, што вельмі добра, калі ў чалавека вялікая сям'я, некалькі братоў і сясцёр. Яны не ўспрымаюць сястру як канкурэнтку. А мы дзелім любоў пароўну на ўсіх дзяцей.

— Дзе хлапчукі вучацца — у школе або настаўнікі прыходзяць дадому?

Раман: — У звычайнай школе, у інтэграваным класе. Я лічу, што сфера адукацыі для асаблівых дзяцей развіваецца лепш, чым медыцына. Магчыма, зараз нешта змянілася, але калі нарадзіліся нашы хлопцы, медыкі тлумачылі нам няшмат. Або вось такі пасыл: «Паглядзім, што будзе, калі ім споўніцца год». На Захадзе зусім іншы падыход: там з першых дзён жыцця, адразу пасля адключэння ад апаратаў штучнага дыхання, неданошаных дзяцей уключаюць у рухальную праграму. Распрацаваны цэлыя методыкі, якія запускаюць рухальныя функцыі. Там разумеюць, наколькі важна не марнаваць час. Калі б мы самі не пачалі цікавіцца, кансультавацца, паказваць хлопчыкаў розным спецыялістам, было б значна горш. На мой погляд, трэба даваць бацькам дакладныя інструкцыі, што і як рабіць з першага дня жыцця дзяцей, пры неабходнасці вылучаць цьютараў — памочнікаў. За мяжой робяць вялікі ўпор на лячэнне асаблівых дзетак менавіта ў першыя гады жыцця, каб потым зняць інваліднасць. Тады ў чалавека будзе зусім іншая якасць жыцця. Вядома, затраты нясе і дзяржава, але яны непараўнальна меншыя, чым калі чалавек застаецца інвалідам на ўсё жыццё.

Інтэграваныя класы я лічу добрай практыкай. Яны даюць магчымасць асаблівым дзецям сацыялізавацца. З іншага боку, нават хуліганістыя хлопцы пачынаюць адчуваць адказнасць за тых, хто слабейшы.

— Раман, а вы ніколі не думалі пра тое, што, карыстаючыся публічнасцю-папулярнасцю, можна было папрасіць дапамогі ў паклоннікаў, арганізаваць збор сродкаў, каб неяк палегчыць сабе жыццё?

Раман: — Не. Гэта нашы дзеці і наша адказнасць. Мне было б проста сорамна так рабіць, таму што ў тых жа цэнтрах рэабілітацыі я бачу сем'і з меншым дастаткам, чым наша. Нярэдка толькі адна маці клапоціцца пра дзіця. А ў нас усё добра. Нас вельмі падтрымліваюць бацькі. Перш за ўсё, яны любяць унукаў, прымаюць іх такімі, якія яны ёсць. Заўсёды адгукаюцца, калі патрэбна дапамога, калі я ў ад'ездзе. Аксаніны бацькі цяпер жывуць у доме каля Белавежскай пушчы. У іх вялікая гаспадарка, і яны забяспечваюць нас гароднінай, садавіной, мясам, малочнымі прадуктамі. На ўсё лета яны забіраюць да сябе хлапчукоў. Для іх там такое раздолле! Бацькі Аксаны вельмі ненавязліва, з элементамі гульні і, вядома, улічваючы магчымасці хлопцаў, прывучаюць іх да працы. Сыны пасуць качак, водзяць гусей на вадаём. Дзеці — сапраўдныя эксперты па хатняй птушцы! Яны ведаюць, якім «вакалам» курыца паведамляе, што знесла яйка. Стас і Глеб бяруць кошык і ідуць іх збіраць. Бабуля навучыла, што адно яйка трэба абавязкова пакінуць, каб курыца вярнулася на наседжанае месца. Калі я прыязджаю ў вёску, то іду з сынамі на рыбалку. На канікулах мы, вядома, пабываем у рэзідэнцыі Дзеда Мароза.

— Раман, калі ехала з «Песнярамі» на гастролі ў Гомель, чула, што вы інструктавалі калегу, як правільна павесіць жырандолю. А што яшчэ вы робіце ў доме сваімі рукамі?

Раман: — Жырандолю я павесіў без старонняй дапамогі. Прыдумаў цэлую сістэму, як яе падняць, застаючыся на драбінках. Шкадую, што не зняў ролік... Так атрымалася, што ў гэтую кватэру я заязджаў адзін — Аксана была ў радзільні. У мяне было два месяцы, каб падрыхтаваць жыллё да прыезду сям'і. Не скажу, што ўсё зрабіў сам, — гэта проста немагчыма. Дапамагалі родныя, сябры, калегі. Люблю такую змену дзейнасці — гэта дае магчымасць цалкам пераключыцца, па-свойму адпачыць. Зноў жа ўсё ідзе з бацькоўскай сям'і: нас, траіх братоў, так выхавалі. Разам з бацькамі рабілі рамонт у кватэры, апаратуру з татам рамантавалі, усе ў вёсцы працавалі, так што для мяне гэта не ў навіну.

«Калі нарадзіліся нашы хлопцы, медыкі тлумачылі нам няшмат. Або вось такі пасыл: «Паглядзім, што будзе, калі ім споўніцца год». На Захадзе зусім іншы падыход».

— Аксана, на вас — калясальная нагрузка. Як пры гэтым атрымліваецца добра выглядаць?

Аксана: — Мне падабаецца быць прыгожай! А калі сур'ёзна, то дзецям патрэбна прыгожая, жыццярадасная мама. Вядома, нам было няпроста прыняць сітуацыю з хлапчукамі. Было ўсё: слёзы, адчай, паніка. Але мы гэта пераадолелі. Дзеці павінны бачыць усмешку, адчуваць клопат і нашу любоў.

— Чытала, што ў часы мулявінскіх «Песняроў» нібыта быў клуб жонак. А зараз?

— Цяпер такога клуба дакладна няма *(смяецца)*. Калектыў ансамбля невялікі, вядома ж, мы сябруем сем'ямі, падтрымліваем і дапамагаем адно аднаму.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота Святланы КОВАЛЬ і з сямейнага архіва КОЗЫРАВЫХ.

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении третьих повторных торгов в форме аукциона по продаже комплекса объектов недвижимого имущества ООО «КБСТ – управляющая компания холдинга « КБСТ-Холдинг», находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).

Дата и время проведения торгов: **8 февраля 2019 года.** Начало в 10.00. Заявки принимаются с 17 января 2019 года по 7 февраля 2019 года.

Место проведения торгов: г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036), 223060, Минская область, Минский район, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41, сайт: http://www.specrealization.by/, тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «КБСТ – управляющая компания холдинга «КБСТ-Холдинг»** (УНП 690595242) в лице антикризисного управляющего Частного унитарного предприятия по оказанию услуг «Управление Право Бизнес». Тел. 8 (029) 6644589.

№ лота		Предмет торгов	Начальная цена, руб.	Шаг торгов	Задаток
1	1	Производственно-складское здание со встроенными блоками административно-бытовых помещений (1-я очередь строительства, 1-й пусковой комплекс) (капитальное строение с инв. № 600/С-147497), общая площадь 4 020,1 кв. м, в том числе	2 440 000,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)	5 %	2 %
	1.1	изолированное помещение, инв. № 600/D-93963, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-101, назначение – складское помещение, общая площадь 83 кв. м	61 000,00 руб.		
	1.2	изолированное помещение, инв. № 600/D-93964, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-102, назначение – производственное помещение, общая площадь 456,6 кв. м	289 500,00 руб.		
	1.3	изолированное помещение, инв. № 600/D-93966, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-103, назначение – складское помещение, общая площадь 48,5 кв. м	36 550,00 руб.		
	1.4	изолированное помещение, инв. № 600/D-93967, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-104, назначение – складское помещение, общая площадь 141,4 кв. м	101 500,00 руб.		
	1.5	изолированное помещение, инв. № 600/D-93968, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-105, назначение – производственное помещение, общая площадь 167,7 кв. м	118 000,00 руб.		
	1.6	изолированное помещение, инв. № 600/D-93969, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-106, назначение – производственное помещение, общая площадь 84,2 кв. м	62 000,00 руб.		
	1.7	изолированное помещение, инв. № 600/D-93970, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-107, назначение – помещение, многофункциональное, общая площадь 194,3 кв. м	134 000,00 руб.		
	1.8	изолированное помещение, инв. № 600/D-93971, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-201, назначение – помещение, общественного питания, общая площадь 23,7 кв. м	19 250,00 руб.		
	1.9	изолированное помещение, инв. № 600/D-93972, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-202, назначение – помещение, санитарно-бытового назначения, общая площадь 21,9 кв. м	17 800,00 руб.		
	1.10	изолированное помещение, инв. № 600/D-93973, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-205 , назначение – административное помещение, общая площадь 71,2 кв. м	55 500,00 руб.		
	1.11	изолированное помещение, инв. № 600/D-93974, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-206, назначение – производственное помещение, общая площадь 133,2 кв. м	98 000,00 руб.		
	1.12	изолированное помещение, инв. № 600/D-93975, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-208, назначение – производственное помещение, общая площадь 145,7 кв. м	106 500,00 руб.		
	1.13	изолированное помещение, инв. № 600/D-93976, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-212, назначение – производственное помещение, общая площадь 254,4 кв. м	172 250,00 руб.		
	1.14	изолированное помещение, инв. № 600/D-93977, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-215, назначение – складское помещение, общая площадь 216,1 кв. м	148 000,00 руб.		
	1.15	изолированное помещение, инв. № 600/D-93978, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-220, назначение – помещение, санитарно-бытового назначения, общая площадь 47,2 кв. м	37 650,00 руб.		
	1.16	изолированное помещение, инв. № 600/D-93979, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-301, назначение – административное помещение, общая площадь 1360,4 кв. м	982 500,00 руб.		
	2	Котельная со складом твердого топлива с установленным оборудованием, инв. № 600/С-147503, расположенная по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17/1, назначение – сооружение специализированное энергетики, общая площадь 221,3 кв. м, в том числе	110 000,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)		
	2.1	водоподготовительная установка Eurosoft E91 DWZ 40 фирмы BWT «Польша» – 1 ед.			
	2.2	насос подпиточный CRI – 4 3F фирмы GRUNDFOS – 2 ед.			
	2.3	бак расширительный NG 100/6 фирмы Reflex – 1 ед.			
	2.4	теплообменник пластинчатый тепловой сети P-0,25-30.25-2x (300AA+30AA) фирмы «Термоблок» – 1 ед.			
	2.5	гидрофор DE60/10 фирмы Reflex – 1 ед.			
	2.6	вертикальный емкостный водонагреватель Logalux SU750 фирмы Buderus – 2 ед.			
	2.7	насос котлового контура TP40-60/2 3F фирмы GRUNDFOS – 2 ед.			
	2.8	насос сетевой системы теплоснабжения TRE 80-210/2-S 3F фирмы GRUNDFOS– 2 ед.			
	2.9	насос циркуляционный горячего водоснабжния UPS 25-80B 1F фирмы GRUNDFOS – 1 ед.			
	2.10	насос загрузки бойлера сдвоенный TPD 40-120/2 3F фирмы GRUNDFOS – 1 ед.			
	2.11	чугунный водогрейный газовый котел LOGANO GE 51 фирмы Buderus – 2 ед.			
	2.12	чугунный водогрейный твердотопливный котел KWH-300 фирмы Hameh – 2 ед.			
	2.13	бак расширительный NG 600/6 фирмы Reflex– 2 ед.			
	2.14	электрический шкаф ЩО №14-73 IP54 – 1 ед.			
	2.15	электрический шкаф ЩО №14-73 IP54 – 1 ед.			
	2.16	электрический шкаф ВРУ-1 (ВУ) – 1 ед.			
	2.17	электрический шкаф Щ-81 (РУ-1) – 1 ед.			
	2.18	электрический шкаф (РУ-2) – 1 ед.			
	2.19	электрический шкаф ЩК №106 IP21– 1 ед.			
	2.20	Система трубопроводов с клапанами и запорной арматурой			
	2.21	термовентилятор YWF 4E-350BC фирмы «Тепломаш» – 1 ед.			
	2.22	горелка газовая MG 10/1 фирмы Giersch с газовым котлом XEV 300 1 – 1 ед.			
	3	Насосная станция с установленным оборудованием пожаротушения, с инв. № 600/С-147498, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17/2, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, общая площадь 65,4 кв. м, в том числе	63 500,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)		
	3.1	насос с электродвигателем NB 125-250/249 A-F-A-BAQE фирмы GRUNDFOS – 1 ед.			
	3.2	насос с электродвигателем NB 80-200/188 A-F-A-BAQE фирмы GRUNDFOS – 1 ед.			
	3.3	насос с электродвигателем CR5-15 A-F-A-E-HQQE фирмы GRUNDFOS – 1 ед.			
	3.4	емкость мембранного типа Maxivarem LS фирмы Varem – 1 ед.			
	3.5	электронасос «Гном 10-10» фирмы «ГМС Насосы» – 1 ед.			
	3.6	электроконвектор ЭВНА-2,0/230 фирмы «Терми» – 1 ед.			
	3.7	электрический шкаф ШК 6-132-220 (ШК-6) – 1 ед.			
	3.8	электрический шкаф ШК 6-132-220 (ШК-5) – 1 ед.			
	3.9	электрический шкаф ШК 6-1-2,2-4,4 – 1 ед.			
	3.10	электрический шкаф ШК 3-30-65 – 1 ед.			
	3.11	электрический шкаф – 1 ед.			
	3.12	электрический шкаф ВРУ-1/1 РУ АВР – 1 ед.			
	3.13	Система трубопроводов с клапанами и запорной арматурой			
	3.14	пожарный ж/б резервуар, габариты 16*6*3,7 м – 1 ед.			
	3.15	пожарный ж/б резервуар, габариты 16*6*3,7 м – 1 ед.			
	4	Трансформаторная подстанция с установленным оборудованием, с инв. № 600/С-147499, расположенная по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17/3, назначение – сооружение специализированное энергетики, общая площадь 21,4 кв. м, в том числе	8 800,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)		
	4.1	трансформатор ТМГ12-400/10-У1 – 1 ед.			
	4.2	счетчик учета электроэнергии (тип СС-301) – 1 ед.			
	5	Здание КПП, с инв. № 600/С-149051, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17/4, назначение – здание специализированное иного назначения, общая площадь 7,9 кв. м (в техническом паспорте на данный объект отсутствует информация о дате ввода его в эксплуатацию)	4 650,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)		
	6	Склад, с инв. № 600/С-148948, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, общая площадь 10 053,4 кв. м, в том числе	5 472 500,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)		
	6.1	изолированное помещение, инв. № 600/D-94367, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17/5-1, назначение – складское помещение, общая площадь 7675,8 кв. м	4 127 500, 00 руб.		
	6.2	изолированное помещение, инв. № 600/D-94369, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17/5-2, назначение – административное помещение, общая площадь 1143,5 кв. м	660 000, 00 руб.		
	6.3	изолированное помещение, инв. № 600/D-94370, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17/5-3, назначение – административное помещение, общая площадь 1163,9 кв. м	660 000,00 руб.		
	7	Стеллажная система (стеллажное оборудование), высотой 8,9 м, длинной 113,95 м, шириной 1,05 м с 4 проездами (5,4 м*3,6 м) (ячейка размером 1,76*2,07 м) – 16 рядов (в 5-м, 6-м рядах стеллажной системы – отсутствуют верхних три ряда длинной 1,9 м, в 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10-м рядах стеллажной системы отсутствуют поперечки. Стеллажная система (стеллажное оборудование) высотой 8,9 м, длинной 112,05 м, шириной 1,05 м (ячейка размером1,76* 2,07 м) – 1 ряд	174 553,60 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)		
		Общая стоимость лота	**8 274 003,60 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)**		
		Сведение о земельном участке	**Кадастровый номер 623680604601000717, площадь 2,2496 га, принадлежит на праве аренды**		

Для участия в торгах необходимо:

в срок по **7 февраля 2019 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY56MTBK30120001093300086460, в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация». Размер задатка составляет 2 % стоимости лота в размере 165 480,06 белорусского рубля.

Подать организатору торгов в срок с даты опубликования по 07.02.2019 г. (за день до торгов) заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 N 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» по адресу: Минская область, Минский район, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Телефон для ознакомления и осмотра лота: +375 (29) 6644589 – Хлебовец Игорь Николаевич, +375 (29) 6714940 – Марцинкьян Сергей Владимирович.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случаях, если:

– заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;

– на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 168 (28784) от 01.09.2018 г.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 212 (28828) от 02.11.2018 г.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 237 (28853) от 08.12.2018 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

Продавец: ООО «Витмир», г. Витебск, ул. 10-я Загородная, 9Б. Тел. (029) 717-44-58
Наименование предмета торгов, начальная цена, задаток
Лот № 1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным № 200/U-95330, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 10-я Загородная, 9Б, площадь застройки – 150,0 кв. м; назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение; расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000002003238, площадью – 1,2153 га, целевое назначение – для содержания и обслуживания зданий и сооружений (доля в праве постоянного пользования – 23/50). Начальная цена: 11 160,00 бел.руб. Задаток: 1 116,00 бел. руб.
Повторные торги состоятся 01.02.2019 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи заявлений с необходимыми документами: с 17.01.2019 с 8.30 по 31.01.2019 до 17.30. Сумма задатка перечисляется на р/с BY79BLBB30120391418689001001 в дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области, BIC BLBBBY2X, УНП 391418689. Получатель платежа: ООО «Витмир». Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота. Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» 28.11.2018 г.

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты их проведения. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 9.30 до 16.30. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

Мужчыны пра жанчын

Кірыл ШЫМКО: «КАХАННЕ ТАКОЕ ШМАТГРАННАЕ...»

Жанчынам заўсёды цікава ведаць, што думае пра каханне моцны пол. «Алеся» вырашыла падысці да пытання вельмі літаральна і распытаць пра гэта аднаго з самых моцных мужчын Беларусі, рэкардсмена — паўэрліфтара, чыё імя тройчы ўнесена ў Кнігу рэкордаў Гінеса, Кірыла Шымко.

— Вар'яцкія ўчынкі ў імя кахання...

— Так, іх увесь час трэба рабіць. Бо яны выклікаюць буру пачуццяў і эмоцый з абодвух бакоў.

— Жанчыны падобныя на...

— Загадку. Ці разгадаюць мужчыны яе калі-небудзь? Адвечнае пытанне. Цяпер жанчына адна, праз пару гадзін яна зусім іншая... Мы не паспяваем за вамі!

— Каханне — гэта...

— Вострае эмацыянальнае пачуццё прыхільнасці адно да аднаго. Каханне такое шматграннае! Можна сказаць, гэта сукупнасць розных іншых пачуццяў. Яно складаецца, па-першае, з клопату. Калі вам нешта падабаецца, вы будзеце старацца беражліва захоўваць гэта і падтрымліваць у добрым стане, няхай гэта будзе матацыкл або жаночая сумачка, любімы кубак і г. д. З людзьмі гэтак жа: вам ніколі не будзе ўсё роўна, што з каханым чалавекам.

Па-другое, з жалю. Калі вы любіце, вы шкадуеце. Напрыклад, сваё дзіця ці каханую дзяўчыну. Вы заўсёды будзеце аберагаць іх ад чагосьці непажаданага.

Па-трэцяе, з уважлівасці. Вы будзеце ўважлівыя да сваіх блізкіх, прыкмячаючы ў іх любыя змены.

Па-чацвёртае, з цікавасці. Вам заўсёды будзе цікавы чалавек, калі вы яго любіце.

Па-пятае, з матывацыі. Любыя людзі матывуюць рухацца наперад.

І, нарэшце, па-шостае, з захаплення. Вас не перастане захапляць аб'ект натхнення.

— Самае прыцягальнае ў жанчынах — гэта...

— Сексуальнасць. Мужчыны любяць вачыма, гэтага ніхто не адмяняў.

— Што не пасуе ні адной жанчыне?

— Надзяваць маску, гуляць, дэманструючы не тое, што яна ёсць на самай справе, завышаць сабе цану. У большасці выпадкаў мужчыны гэта бачаць. Але некаторыя жанчыны ўмеюць гэта хаваць, і мужчыны не могуць разабрацца, як сябе паводзіць.

Таксама жанчынам не трэба мацюкацца і курыць, асабіста мяне гэта вельмі адштурхоўвае.

— Вядома, што шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз страўнік. А да сэрца жанчыны?

— Праз пачуцці. Мужчына прымітыўны і зразумелы, яго няцяжка разгадаць. У адносінах ён гуляе ў гульні, прыдуманыя жанчынай, пастаянна нешта ёй даказваючы. А жанчыне важна ўсё глыбока адчуць, так задумана прыродай.

— Жанчына павінна быць слабай і безабароннай, або гэта неабавязкова?

— Жанчына спрадвеку выступае не толькі захавальніцай ачага, але і дадаткам да мужчыны, яго важнай часткай. Але не дамінуючай. У некаторых рэчах жанчыны мацнейшыя, яны больш выслоўвыя, напрыклад. Але для гарманічнага развіцця сям'і дамінаваць павінен мужчына. Бываюць выключэнні, але дамінанта жанчыны — дрэнны складнік.

— Найлепшы падарунак для мужчыны — гэта...

— Каштоўны не падарунак, а стаўленне. Таму калі хочацца нешта падарыць, гэта павінна быць тое, што зачэпіць вас дваіх. Напрыклад, майму сябру жонка на Новы год падарыла дзіця *(смяецца)*.

А калі сур'ёзна, гэта можа быць невялікі сямейны фільм, сабраны з адрэзкаў вашых падарожжаў, або футболка са зразумелым для вас дваіх надпісам, ці нават фота. Можа, банальна, але каштоўнасць — у прыцягальнасці жанчыны і мужчыны, а ўжо адлюстраваць гэта можна як заўгодна.

— Зараз сярод дзяўчат існуе трэнд на атлетычныя мышцы. Гэта добра ці вы за натуральную прыгажосць цела?

— Прыгожае, пругкае і падцягнутае цела — гэта заўсёды добра для здароўя, сексуальна і прывабна. Але калі на целе недастаткова тлушчу, гэта ненатуральны стан арганізма. Рэльефнае, абязводжанае цела — гэта ненармальна, трэба сачыць за сваім здароўем.

— Ці ёсць нешта такое, чаго нельга рабіць для жанчыны да вяселля?

— Я б не раіў рабіць дарагія падарункі, тады адносіны выходзяць на ўзровень карысці. Напрыклад, у такім выпадку можна разглядаць мужчыну, ацэньваючы яго фінансавы патэнцыял. Мужчына ж не разглядае жанчыну як сродак узбагачэння, яму важныя яе знешнасць, яе каштоўнасці, яе каханне. А калі задорваць, то як быццам купляеш яе...

— Што больш прыемна: клапаціцца пра каго-небудзь ці калі клапоцяцца пра цябе?

— Калі ты любіш — і тое, і іншае мае значэнне. Бо шчырыя адносіны ў наш час такая раскоша. На жаль, каштоўнасці змяніліся, на першы план выйшлі грошы. Яны абараняюць і даюць свабоду, але не даюць шчасця. Таму так цяжка нам ацаніць тое, што дасталася не за грошы. Напрыклад, здароўе. Мы нараджаемся з ім і не шануем яго, а калі яно пагаршаецца, калі адчуваеш боль і дыскамфорт, калі б'ешся за тое, каб быць здаровым, ужо па-іншаму глядзіш на гэтыя рэчы. Тое ж з клопатам і любоўю: часта іх пачынаюць цаніць, калі страчваюць.

Віталіна БАНДАРОВІЧ.

Кірыл Шымко — беларускі спартсмен-асілак, рэкардсмен Беларусі па сілавым мнагабор'і, тройчы рэкардсмен Кнігі рэкордаў Гінеса.

Яго першая ўнікальная акцыя: з напарнікам Паўлам Сарокам зрушылі з месца і працягнулі на шэсць з паловай метры чыгуначны састаў з пяці вагонаў агульнай масай 250 тон. Затым удваіх з Паўлам Сарокам яны зрушылі з месца і працягнулі больш чым на тры метры самалёт Іл-76, маса якога складае 150 тон.

У 2009 годзе ўстаноўлены першы рэкорд, удастоены занясення ў Кнігу Гінеса: Кірыл Шымко разам з Паўлам Сарокам зрушылі з месца савецкі танк Т-34 вагой 30,9 тоны на адлегласць больш за 5,10 метра.

Неўзабаве Кірыл Шымко падчас шоу ў рэжыме рэальнага часу ўстанавіў новы сусветны рэкорд: у прысутнасці некалькіх тысяч гледачоў зрушыў з месца і працягнуў 55-тонны кар'ерны самазвал «БелАЗ». Трэці рэкорд для Кнігі Гінеса быў устаноўлены ў 2015 годзе: Кірыл у адзіночку зрушыў і працягнуў на адзін метр 43,5 сантыметра вежавы кран вагой 118 тон.

Яшчэ адно незвычайнае сілавое шоу — на аэрадроме «Ліпкі» верталёт Мі-26 вагой у 35 тон Кірыл цягнуў 20 метраў. Дарэчы, менавіта гэты верталёт здымаўся ў фільме «Моцны арэшак-5» з Брусам Уілісам у галоўнай ролі.

«Мне шмат хто кажа, што сваімі дасягненнямі я каму-небудзь што-небудзь даказваю, — каментаваў пасля шоу Кірыл Шымко. — Мне гэта зусім не трэба. Такія падзеі прыцягваюць шмат увагі людзей, і гэта матывацыя, прыклад для тых, хто захоча займацца спортам, весці здаровы лад жыцця і развівацца ў сілавым мнагабор'і. Безумоўна, для мяне важныя і эмоцыі, якія нічым не заменіш. Гэта прыемныя эмоцыі!»

Пажаданне жанчынам

— Дарагія дамы! Я жадаю вам знайсці Каханне. Калі сустрэнеце свайго чалавека, глядзіце не на тое, колькі ў яго матэрыяльных каштоўнасцяў, а на тое, як ён да вас ставіцца. Імкніцеся да сапраўдных пачуццяў. Не забывайце, што, аддаючы, вы будзеце атрымліваць. Грошы... сёння яны ёсць, а заўтра няма. Калі вы заробіце іх у пары, яны прынясуць куды больш шчасця. Таму спачатку важна знайсці таго, хто заўсёды будзе побач і падтрымае вас. Любіце шчыра!

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже права заключения договора аренды земельного участка

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14.

Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка
Лот №1. Право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым № 225581716101000223, расположенного по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, Радюковский с/с, аг. Радюки, ул. Маркова, площадью 0,0603 га, сроком на 25 лет для строительства торгового павильона (целевое назначение: земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель: водоохранная зона реки, водоема (р. Березовка), зона санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора; придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена:** 92,77 бел. руб. **Задаток:** 9,28 бел. руб.
Дата, время и место проведения аукциона: 18.02.2019 в 14.15, г. п. Шарковщина, ул. Комсомольская, 15, в Шарковщинском райисполкоме. Срок внесения задатка и подачи документов: с 17.01.2019 по 15.01.2019. Время работы с 8.30 до 17.30 (обед:13.00 – 14.00). **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY81AKBB36003300040000000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 4002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц)

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка или часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участниками документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, в т. ч. с гос. регистрацией создания этого участка; после выполнения указанных действий заключить с Шарковщинским райисполкомом договор аренды земельного участка; осуществить в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав на земельный участок в Шарковщинском бюро Глубокского филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; срок действия права аренды на земельный участок оканчивается по истечении 25 лет с момента гос. регистрации создания земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него. За три месяца до окончания срока аренды на земельный участок совместно с Шарковщинским райисполкомом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования; получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Шарковщинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год; приступить к занятию земельного участка (начать строительство) в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации; снять на занимаемом участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации; завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией. Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Контактные тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

Фотаздымак з гісторыяй

А памяць жыве...

Хто мы ў гэтым шматгранным, цікавым, недзе вар'яцкім, але такім захапляльным свеце? Пясчынкі ў мірыядзе сузор'яў і планет, травінкі ў зялёным бязмежжы зямлі, разумныя істоты, якім трэба выжыць. І не толькі. Неабходна нешта зрабіць за тое кароткае імгненне, пакінуць пасля сябе памятны след. А жыццё ў кожнага рознае і складанае...

Заходняя Беларусь, 1933 год. У вёсцы Панюцічы Сноўскай гміны Навагрудскага павета яшчэ польская ўлада. Дзейнічаюць школы на чужой мове, людзі ў вёсках жывуць аднаасобнымі гаспадаркамі. На гэтым здымку змешчаны жыхары вёскі Панюцічы каля хаты Адама Міхайлавіча Хвіра, які стаіць злева. Далей — яго жонка Зінаіда Ніканораўна з маленькім сынам Славам. Дарэчы, у маладосці яе партрэт намаляваў вядомы мастак Міхаіл Сеўрук, цяпер гэта карціна знаходзіцца ў Яраслаўлі, дзе жыве ўнучка Зінаіды. За імі сядзяць стрыечны брат Зіны Анатоль Сержан і яго жонка, унізе дзеці названых людзей. Справа сядзіць Аляксандра Лятніцкая з дачкой Лёдзяй. Ля іх стаіць муж і бацька Ян Уладзіслаў Лятніцкі, паляк. Дарэчы, вельмі цікавы быў чалавек: маляваў прыгожыя карціны, якія выстаўляліся не толькі ў Польшчы, але і ў іншых краінах Еўропы. Ён ажаніўся з Шурай, і жылі яны да вайны хораша і ў ладзе. Грозныя гады Вялікай Айчыннай сваім чорным крылом перакрэслілі мірнае жыццё вяскоўцаў. У жніўні 1941 года па вёсцы прайшла чутка, што немцы хапаюць мужчын. Па вуліцы ішлі фашысты з аўтаматамі наперавес і з эмблемамі чарапоў на касках. Яны выпіхвалі з хат маладых мужчын, якія аказаліся «ненадзейнымі» і па даносе мясцовага здрадніка трапілі ў рукі акупантаў. Сярод схопленых былі браты Адам Міхайлавіч і Антон Міхайлавіч Хвіры. Немцы пагналі дзесяць чалавек у канец вуліцы і пагрузілі ў машыну. Уся вёска была ў шоку, крычалі і плакалі жанчыны, дзеці. Захопленых адвезлі ў Баранавічы, жанкі потым ездзілі туды, але нічога не дабіліся. Дзе загінулі смелыя вяскоўцы, невядома і дагэтуль. Людзі выказвалі меркаванне, што іх адвезлі ў лагер Калдычэва, адкуль амаль ніхто не выбіраўся жывым. Трагічны лёс напаткаў і Яна Уладзіслава Лятніцкага, якога пазней фашысты расстралялі ў лесе паблізу Снова.

Тры сям'і, адлюстраваныя на здымку, былі мірныя і па-свойму шчаслівыя. Хіба яны маглі ведаць, што іх чакае напярэдзе грозная навала... Фатаграфія блізкіх мне людзей захоўвалася ў альбоме маёй швагеркі з Мінска, дачка якой пераслала мне гэты цікавы гістарычны дакумент. Шкада толькі, што застаўся невядомым аўтар здымка. Але жыве памяць пра тых мужных людзей.

Раіса ХВІР,

г. Нясвіж.

Мама, пачытай!

Лёля БАГДАНОВІЧ

КУХАРКА ЗОСЬКА

(Казка)

Даўно гэта было. Жыла ў адной вёсцы сіротка Зоська. І рысамі твару прыгожая, і постаццю стройная. І душою багатая, і сэрцам пяшчотная. Ніводнага чалавека не было ў вёсцы, якому б яна не дапамагла. Каму вядзерца вады прынясе. Каму пустазелле парве на градах. Каму вуліцу падмяце. Любілі дзяўчынку аднавяскоўцы, і кожны жадаў ёй добрай долі.

Аднаго разу сярод ночы падалося Зосьцы, што нехта кліча яе:

— Слухай, дзіцятка, што я табе зараз скажу! — расплюшчыла яна вочкі, а перад ёю жанчына нейкая стаіць. — Не бойся мяне, — гаворыць. — Залатая душа ў цябе. Таму і хачу ўзнагародзіць за ўчынкі твае добрыя. Заўтра раненька ўстань, пакладзі ў торбачку моркву, малачка бутэльку, хлеба лустачку і люстэрка матчына маленькае, што на паліцы ляжыць, ды адпраўляйся ў суседнюю вёску да цёткі Тэклі.

— А дзе яна жыве? — ледзь чутна прашаптала дзяўчо.

— Спытаеш у любога. Яе там і старыя, і малыя ведаюць. На ўсю ваколіцу найвыдатнейшая кухарка. Аддасі ёй вось гэту стужачку чырвоную. Яна цябе і навучыць поварскім прамудрасцям. У жыцці спатрэбіцца. Як будзеш праз лес ісці, выскачыць зайчык з-за куста. Аддасі яму морквачку. Вожычка малачком пачастуй. Люстэрка вавёрачцы аддай. Ой, і любіць яна перад ім круціцца! Яны табе дарогу і пакажуць.

Сказала так жанчына і прапала. Лыпае спрасонку вочкамі Зоська — ці то прыснілася ёй, ці на самай справе было? Аднак не развіднела яшчэ, а яна ўжо ў дарозе. Бяжыць праз лес, а насустрач ёй зайчык. Накарміла яго Зоська морквай ды пабегла ў той бок, куды ён паказаў. Адкуль ні вазьміся вожычак выкаціўся. Наліла дзяўчынка яму малачка ў сподачак, пастаяла некалькі хвілінак ды паімчала ў патрэбны бок. А тут вавёрачка. Саскочыла з елкі з арэшкам, а Зоська ёй люстэрка ўзамен. Паскакала рыжанькая папарадзе. Дзяўчынка за ёю. Нарэшце прыйшла ў вёску. Знайшла цётку Тэклю і стужачку аддала. Пачала вучыць яе Тэкля ўсяму, што сама ведала. А дзяўчынка надзіва здольная аказалася. Праз якія месяцы тры яна ўжо не толькі супы і кашы гатавала, а і верашчаку, зразы, біткі, поліўку, юшку, зацірку, студзень, мачанку, драні. Адным словам, усе стравы беларускай кухні. І пайшла слава пра кухарку Зоську далёка за межы вёскі. Прачуў пра яе малады паніч. Прыехаў, каб узяць на службу. Ды, убачыўшы прыгажуню, адразу ж закахаўся. Згулялі яны вяселле. І зажылі дружна і весела. Вось так, мае маленькія, дзякуючы дабрыні і старанню ўдала склаўся лёс сірацінкі Зоські.

Нататкі шматдзетнага таткі

Малодшыя дзеці з сябрамі прыдумлялі розныя рэбусы. Суседская дзяўчынка намалявала на аркушы тры дрэвы, нейкі мудрагелісты лабірынт і суправадзіла ўсё надпісам: «знайдзі чацвёртае дрэва».

Уважліва прыгледзеўся да карцінкі, да лабірынта, але ніякага чацвёртага дрэва не знайшоў. І раптам мяне асяніла, і я перавярнуў лісток і паглядзеў з адваротнага боку. Але замест чаканага дрэва там быў надпіс: «ты дурань».

І я падумаў, як мала часам аддзяляе трыумф ад ганьбы...

* * *

Поля:

— Калі я была маленькая і ўдаралася пальцамі на назе, я потым заўсёды пералічвала пальцы.

— Навошта?

— Баялася, што адзін адваліцца.

Гучыць смешна, але я днямі так трэснуўся мезенцам аб касяк, што мне захацелася не толькі пальцы, а яшчэ і зубы пералічыць.

Павел ХОЛАД.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

САЛАТА «ПЯШЧОТНАЯ»

Спатрэбіцца: *свежая пекінская капуста — 200 г, кансерваваная кукуруза — 3 ст. л., свежы агурок (сярэдніх памераў) — 1 шт., свежая морква — 1 шт., зубчык часнаку, маянэз, соль — на смак.*

Капусту нашаткаваць і паціскаць рукамі. Агурок нарэзаць тонкай саломкай. Моркву надзерці на бурачнай тарцы, зубчык часнаку здрабніць.

Усё змяшаць і заправіць маянэзам, пасаліць пры неабходнасці.

КУРЫНЫЯ КАТЛЕТЫ З СЫРАМ

Спатрэбіцца: *яйкі — 2 шт., курынае філе — 2 шт.; маянэз — 3 ст. л., мука — 50 г, цвёрды сыр — 150 г, пару галінак кропу, соль і перац на смак.*

Курынае філе нарэзаць невялікімі кубікамі, змяшаць яго з надзёртым на буйной тарцы сырам і здробненым кропам. Дадаць да філе яйка, маянэз, муку, соль і перац.

Масу, якая атрымалася, паставіць на 2—3 гадзіны ў халадзільнік. Можна нават з вечара падрыхтаваць, а раніцай смажыць катлеты.

Нагрэць патэльню, дадаць алей, выкладваючы лыжкай фарш, смажыць катлеты, як аладкі, з двух бакоў да гатоўнасці.

Калі катлеты гатовыя, выкласці іх на папяровы ручнік, каб пазбавіцца ад лішкаў тлушчу.

Падаваць гарачымі з любімым гарнірам ці соусам.

РУПЛІВАЙ ГАСПАДЫНІ

СРОДАК ДЛЯ ЧЫСТКІ З АПЕЛЬСІНАВЫХ СКУРАК

Ліманен, які змяшчаецца ў лупіне цытрусавых, валодае ўласцівасцю чысціць. Таму даволі часта гэтае рэчыва сустракаецца ў складзе натуральных экалагічных сродкаў для ўборкі. Такі сродак мы можам прыгатаваць і самі. Ён называецца апельсінавы воцат.

Спатрэбіцца: паўлітровы слоік; лупіна ад 2—3 вялікіх апельсінаў; бутэлька воцату.

Слоік знутры высцілаем апельсінавымі скуркамі, каб увайшло як мага больш. Затым запаўняем ёмістасць воцатам, пакрываючы скуркі цалкам. Шчыльна закаркоўваем і адпраўляем слоік у цёмнае прахалоднае месца на два тыдні. Потым працэджваем.

Універсальны ачышчальнік гатовы! Перад выкарыстаннем яго разводзяць вадой 50:50. Апельсінавым воцатам можна мыць усё. У спалучэнні са звычайнай харчовай содай ён добра чысціць нават грыль і духоўку.

САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

ДОГЛЯД ЗА ВАЛАСАМІ ЗІМОЙ

У зімовы перыяд валасы найбольш пакутуюць ад частых перападаў тэмператур. Каб іх зберагчы, а таксама падтрымаць здароўе і прыгажосць, прытрымлівайцеся правілаў зімовага догляду за валасамі.



- Выпівайце ў дзень каля двух літраў вады для падтрымання водна-салявага балансу.
- Сілкуйце і ўмацоўвайце валасы пры дапамозе натуральных масак у хатніх умовах. Для ўмацавання можна зрабіць наступную маску: натрыце на дробнай тарцы невялікую моркву, дадайце да яе 5—6 кропель рыцыны, 1 ч. л. смятаны або вяршкоў, а таксама трохі моцнага чаю. Нанясіце на скуру галавы і валасы на 40 хвілін пад плёнку і ручнік. Змыйце цёплай вадой і шампунем для свайго тыпу валасоў.
- Выкарыстанне прасаў, фенаў, плойкі скараціце да мінімуму. Пад уздзеяннем высокіх тэмператур валасы губляюць натуральную прыгажосць, становяцца ломкімі і сухімі. Калі валасы непаслухмяныя, а вы не ўяўляеце, як абысціся без дапаможных прыбораў, выкарыстоўвайце эфектыўны бальзам ці тэрмаабаронны спрэй. Адмоўцеся на час ад заколак і тугіх гумак.
- Спецыялісты рэкамендуюць мыць галаву па меры забруджвання. Вада павінна быць цёплай, бо гарачая разбурае і сушыць структуру воласа, правакуючы яшчэ большае выдзяленне сальных залоз. Перад нанясеннем бальзаму, кандыцыянера або маскі злёгку прамакніце валасы ручніком.
- Дадайце ў сваё меню арэхі, зяленіва, кісламалочныя прадукты.

«ХТО БАЦЬКУ І МАТКУ ЗНЕВАЖАЕ, ТОЙ ДАБРА НЕ ЗНАЕ» (Беларуская народная прыказка).

«Суджаны-згоджаны...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэта ж гульня хутчэй, а не варажба, — супакойвае Надзея Данілаўна. — Мы ж не да цыганкі хадзілі або варажбіткі, якая нешта там падрабляе. Для нас гэта былі звычайныя сельскія забавы. Мы і спявалі, і танцавалі, і загадкі загадвалі, і страшылкамі адзін аднаго пужалі. Я іх ведаю — вой колькі. І пра змяю, якая людзей ела, і пра свінку — залатую шарсцінку, і пра нячысцікаў. Да вайны ў нашай мясцовасці нават варажбіт жыў — у Навасёлках. Калі нешта з двара знікала, людзі ішлі да яго, і ён называў злодзея. Бачыў наскрозь, як Месінг. Аднойчы яго нават забіць хацелі, а ён раптоўна стаў нябачны. Адным словам, варажбіт. Вось з кім лепей не звязвацца. А мы ўсё боскае рабілі — карагоды вадзілі, песні спявалі. Ад Раства да Хрышчэння нельга было ні мыць, ні прасці — вось мы і весяліліся. Збіраліся ў каго-небудзь на «хэйдары», як мы паміж сабой называлі падыходзячую для гульняў хату. Клуба ж тады не было.

— А колькі гульняў прыдумлялі, не пералічыць, — дадае Людміла Сцяпанаўна. — Ступу пераварочваем, хлопец з дзеўкай садзяцца спіна да спіны. На раз-два-тры паварочваюцца адзін да аднаго, калі ў адзін бок, то трэба цалавацца. Дзяўчаты пішчаць, уцякаюць, хлопцы іх даганяюць, цалуюць. Насмяёмся, аж у баку заколе.

99 дзяўчат

Пра Галавенчыцы калісьці казалі, што тут жыве 99 дзяўчат. Ніхто іх, калі шчыра, не лічыў, але лічба ўражвала. І кавалераў сюды цягнула як магнітам з усіх навакольных вёсак. Хамянкі, Буда, Антонаўка, Залессе, Астрэні — толькі паспявай выбіраць жаніха.

— Ух, як мы варажылі на хлопцаў, я свайго таксама «наваражыла», — гарэзліва кажа Данілаўна. — У 11 гадзін вечара бяжым з сяброўкамі на крыніцу вады набраць, назад ідзём ціха, не размаўляем і не аглядваемся. А ў доме ўжо для справы ўсё гатова. За фіранкай стол, пасярод люстэрка, перад ім і за ім свечкі. Льеш ваду ў шклянку і туды ж вянчальнае кальцо кідаеш удовіна. Свечкі запальвалі і садзіліся. А дванаццатай гадзіне пачыналі гадаць. Я хвілін пяць сядзела і ўбачыла хлопца ў светлым касцюме і плашчы. Хуценька люстэрка перакуліла, а сэрца ледзь з грудзей не выскоквае. Людзі расказвалі, што адна дзяўчына варажыла з люстэркам, і ёй труна паказалася. Яна і памерла ў хуткім часе. Напэўна, такі лёс быў. Мне ж было наканавана за аднавяскоўца выйсці. Потым высветлілася, што ён таксама бачыў мяне ў сне. Расказваў, што я падышла да яго з ручніком і абцірала. Калі мы пазнаёміліся, адразу ж пазналі адно аднаго.

У Сцяпанаўны свая гісторыя:

— Я ведала шмат спосабаў варажэння. Можна было, напрыклад, грэбень пад падушку пакласці і паклікаць: суджаны-згоджаны, прыйдзі мяне расчасаць, і класціся спаць. А я капейкі насыпала і запрасіла нарачонага дапамагчы падлічыць. У мяне быў кавалер з Залесся, які дужа мне падабаўся і хацела за яго замуж. І ён да мяне сімпатыю праяўляў — на танцы запрашаў і да дому праводзіў. Але ж прысніла зусім іншага хлопца, з нашай вёскі. У нас яго хурманёнкам дражнілі. Ён тады наогул з'ехаў з нашай вёскі і невядома было, ці вернецца. Таму вельмі здзівілася, калі ў сне ўбачыла яго. Прыснілася, што ён прыйшоў да мяне і цэлую жменю цукерак насыпаў. Напэўна, купіў за мае грошы *(усміхаецца)*.

Варыянтаў даведацца пра мужа ў галавенчыцкіх прыгажунь заўсёды было шмат. Мяне наперабой інструктуюць, як трэба кідаць валёнак, куды класці галёшы, як па дровах даведацца, быць табе ў пары або не. Альбо можна з сяброўкамі кінуць па аладцы сабаку, чыю ён першую схопіць, тая першая і замуж пойдзе. У Галавенчыцах яшчэ забаўляліся

Сябровак аб'яднала любоў да родных каранёў.

тым, што ноччу стукаліся да патэнцыйных нявест у вокны. Калі адкажа «хто там?», застанецца сядзець у дзеўках. А калі дазволіць — «ідзі», значыць, хутка сваты прыйдуць.

Успомнілі сяброўкі і кур'ёзны выпадак, калі іх здымала тэлебачанне і яны на заказ варажылі. Насыпалі некалі кучак зерня ў хаце і прынеслі пеўня — чыё зерне першае клюне, тая, маўляў, першая і замуж пойдзе. Адкуль яму ведаць, што ў «нявест» ужо ўнукі падраслі.

— А певень пастаяў і ні разу не клюнуў. Падумаў, напэўна, вось старыя зусім з глузду з'ехалі, — смяюцца жанчыны.

На вёсцы не сумна

З нагоды сустрэчы з карэспандэнтам «Звязды» Данілаўна надзела матчын андарак у клетачку і падперазалася фартухом з вышыўкай. А Сцяпанаўна надзела вышываную кашулю з сімвалічнымі кветачкамі. Жанчыны захоўваюць не толькі народную творчасць, але і апранаюцца па «модзе» тых часоў.

— Калядныя песні пра вячоркі мы таксама спявалі, — кажа Данілаўна. — А калі аб'ядналіся ў калектыў, яны сталі часткай нашага рэпертуару. У мяне цэлы сшытак быў песень, магчыма 500, а то і болей. Разам з тэкстамі запісвала і імёны тых, хто нам іх даваў. Большую частку надыктавала жыхарка нашай вёскі Марыя Петрачэнка. Мы не пераставалі здзіўляцца, як шмат яна іх ведае.

— Мы ўжо ў 1959 годзе сталі лаўрэатамі абласнога конкурсу, 100 рублёў прэміі атрымалі, — усміхаецца Данілаўна, якая з 1972 года была нязменным кіраўніком калектыву. — Нас двойчы здымала тэлебачанне. Першая кінастужка называлася ў духу нашай размовы «У калядныя вечары», другая — «Жорсткі раманс». Я гэты раманс пачула ў 1958 годзе, калі гасціла ў брата пад Ленінградам. Ён мне запомніўся.

Яна пачынае спяваць, і атрымліваецца гэта ў яе так душэўна і чуллівa, быццам яна пра свой лёс расказвае. І голас такі аксамітны, цягучы — амаль як у Русланавай. Ён, дарэчы, дастаўся ёй у спадчыну ад маці, якая спявала ў мясцовай царкве на клірасе.

— На Хрышчэнне мы заўсёды туды хадзілі. Старыя людзі казалі, што ў нас спачатку была драўляная царква, але Пётр Першы забраў яе ў Лясную, і нам цагляную пабудавалі. Прыгожая была, словамі не перадаць. Але падчас Вялікай Айчыннай у яе снарад трапіў, засталіся адны падвалы. Цяпер на гэтым месцы крыж.

Размова плаўна пераходзіць на іншыя тэмы, пра апошніх жыхароў вёскі, пра абыякавасць маладых да родных каранёў. Напэўна, калі б не неабходнасць паспець на рэйсавы аўтобус, мы б яшчэ доўга так размаўлялі. Тым больш што адпускаць мяне не жадалі катэгарычна. Запрашалі пакаштаваць спецыяльна прыгатаваныя стравы для каляднага стала. І хоць так смачна выглядалі той халадзец і катлеты з тоўчанай бульбай, прыйшлося адмовіцца. І пакуль ехала да Магілёва, не пераставала здзіўляцца, якое ж насычанае ў гэтых жанчын жыццё. Кажуць, што на вёсцы сумна. Але цяпер я дакладна ведаю, што тут усё залежыць выключна ад самога чалавека.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Кіно

Паміж Рублёўкай і туманным Альбіёнам: пяць прэм'ер студзеня

Пачатак года — гэта не толькі гастранамічная паўза пасля навагодніх і калядных застолляў. Традыцыйна гэта яшчэ і шэраг прэм'ер, інтарэс да якіх майстры сучаснай кінаіндустрыі падагрэлі загадзя, а вось наколькі ён спраўдзіўся? «Звязда» прыгледзелася да рэпертуару айчынных кінатэатраў у студзені 2019-га.

«Мэры Попінс вяртаецца»

Сямейны мюзікл з бюджэтам у 130 мільёнаў долараў ідзе ў беларускім пракаце з 3 студзеня і аншлагаў, шчыра кажучы, не збірае. Хоць, здавалася б, усе складнікі на месцы: настальгія (адсылка да галівудскай экранізацыі 1964 года — ролю камінара там і банкіра тут выконвае адзін і той жа акцёр Дзік Ван Дэйк), чараўніцтва (заплывы ў ванне-акіяне, падарожжа ўнутр фарфоравай вазы, палёты на парасоне і шарыках і г. д.), шмат добрай музыкі (хоць, вядома, англійскі гумар губляецца ў рускім дубляжы), абаяльнае трыа дзяцей-акцёраў і міс «Сама дасканаласць», якую ўвасобіла Эмілі Блант. Але разам з тым сюжэт, які не з'яўляецца часткай кнігі Памелы Трэверс, намаляваны празмерна ўмоўнымі штрыхамі, наіўнае дыснееўскае чараўніцтва пасуе для вельмі вузкіх узроставых рамак — наўрад ці фільм будзе цікавы вашым дзецям, калі яны ўжо не вераць у фей і Дзеда Мароза, а ад дарослых акцёраў застаецца пачуццё недаказанасці: увесь час чакаеш, што вось яны выдадуць што-небудзь такое, мудрае і важнае, але не, вусны падціскаюцца, сюжэт рушыць далей. І кінаторт атрымліваецца як быццам смачны, але ці то сіропу зашмат, ці то начыння малавата.

«1+1: галівудская гісторыя»

Пераказ арыгінальнай сацыяльнай камедыі пра тое, што паміж бедным і здаровым ды багатым і хворым магчыма цудоўнае сяброўства, якое перакуліць з ног на галаву жыццё абодвух, — далёка не першы па ліку. Відаць, таму ў рэйтынгу кінакрытыкаў фільм ацэньваецца як «сярэдзіна на палову», крыху больш як на 55 са 100 %. У беларускі ж пракат стужка трапіла 10 студзеня.

Што адметнага ў галівудскім варыянце? Удзел сцэнарыста Аліўе Накаша, які ўласна пісаў сцэнарый і здымаў самую касавую ў гісторыі французскую камедыю «1+1» 2011 года, а таксама яе лакальную копію — аргентынскі рэмейк 2016-га, і рэжысёрская работа Ніла Бергера, якога раней крытыкі шмат хвалілі і ўпікалі за «Ілюзіяніста» і «Дывергента». У астатнім усё тое ж самае: прыкаваны да інваліднага вазка інтэлігенты мільянер (Браян Крэнстан) шукае памочніка, якім па іроніі лёсу становіцца самы непрыстасаваны з усіх кандыдатаў, беспрацоўны і нядаўна вызвалены з турмы маргінал (адзін з самых вядомых сучасных комікаў Кевін Харт)... Словам, калі вы не глядзелі першай работы, фільм хутчэй спадабаецца, калі ж глядзелі — міжволі пачняце вышукваць у рэмейку недахопы і кіналяпы.

«Снежная Каралева: Залюстроўе»

Выключна навагодняе мультыплікацыйнае 3D-фэнтэзі, здаецца, знятае спецыяльна для школьных канікул — хоць у пракаце будзе знаходзіцца да 23 студзеня.

Гэта, на хвілінку, ажно чацвёртая частка анімацыйнага цыкла пра Снежную Каралеву, знятага пры ўдзеле знакамітай студыі «Саюзмультфільм», але, як многія іншыя фільмы, яе можна глядзець з любога моманту — на разуменне і ўспрыманне чарговасць ніколькі не ўплывае. Хто ў кадры на гэты раз? Магутны кароль Харальд, які ледзьве не страціў сям'ю з-за Снежнай Каралевы і ў адказ знайшоў спосаб раз і назаўжды ачысціць свет ад чараўніцтва. Усіх, у кім ёсць хоць кропля магічных здольнасцяў, кароль ізалюе ў Залюстроўі. Але ёсць і тыя, хто не згодны, каб казка назаўжды знікла з жыцця, — і Герда, чыя сіла зусім не ў магіі, але ў веры ў сяброўства і дабрыню, спрабуе спыніць антычараўніцкі крыжовы паход. Галоўны плюс гэтай гісторыі — яна падыходзіць для гледачоў любога ўзросту і ненавязліва спалучае казачныя прыгоды і павучальныя ідэі: напрыклад, аб тым, што дзеля поспеху можна аб'яднацца з былым ворагам. Праўда, ад класічнага андэрсэнаўскага сюжэта тут засталося няшмат і акцэнты дабра і зла размыліся, дый запазычаныя персанажы, ад трансформераў да чырвонага цмока, пазбаўляюць сюжэт рэшткаў логікі, але затое дадаюць відовішчнасць.

«Паліцэйскі з Рублёўкі. Навагодняе бязладдзе»

Насамрэч гэта расійская камедыя — працяг аднайменнага папулярнага тэлесерыяла — выйшла ў пракат яшчэ 20 снежня, але ўсё ж вартая ўключэння ў спіс заўважных кінапрэм'ер. І не толькі таму, што ў ёй іграе ўжо раскручаная беларуска Аляксандра Борціч, але яшчэ і з той прычыны, што ў Мінску і ў Маскве чацвёрты тыдзень запар уваходзіць у тройку самых касавых фільмаў.

І што ў ім такога, спытаеце вы. Вось сюжэт: напярэдадні Новага года аддзяленне паліцыі «Барвіха Паўночная» аказваецца пад пагрозай закрыцця. «Паліцэйскі з Рублёўкі» Грыша Ізмайлаў, ратуючы родны аддзел, разам з аператыўнікамі ладзіць абрабаванне банка, якое калегі мусяць хутка раскрыць і захаваць працу, але штосьці ідзе не так. Дакладней, усё. У выніку — мноства прыгод, клаўнады, кемлівасці і глупства, драйву, што стварае даволі моцную, насамрэч смешную камедыю, якая затрымаецца ў айчынным пракаце да 16 студзеня.

«Шлях дадому»

90 хвілін сямейнай меладрамы, увесь сюжэт якой пераказаны ўласна ў рэкламным слогане «Яе вядзе не павадок, а любоў». Як няцяжка здагадацца, гаворка пра сабаку па мянушцы Бела, чые прыгоды расказалі гледачам дзеячы кіно, якія, даруйце за каламбур, сабаку з'елі на здымках фільмаў пра жывёл: рэжысёр Чарльз Марцін Сміт («Гісторыя дэльфіна») і дуэт сцэнарыстаў Кэтрын Мішон і В. Брус Кэмеран, якія ў 2017-м прадставілі кранальную сямейную камедыю «Сабачае жыццё». Вось і гэтым разам сабака, які пагнаўся за вавёркай і заблукаў у лесе, пераадольвае шлях даўжынёй больш як у 400 міль, каб напрыканцы ўз'яднацца з любімым гаспадаром. І хоць, безумоўна, гэта не «Хаціка», але людзям, для якіх хатнія ўлюбёнцы — не толькі сябры, але паўнапраўныя члены сям'і, прыгоды Белы, пэўна, спадабаюцца.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «МЭТЗ ИМ. В. И. КОЗЛОВА», г. Минск, ул. Уральская, д. 4, каб. 502

Предмет аукциона (одним лотом)
Месторасположение: Минская обл., Пуховичский р-н, Свислочский с/с

Наименование	Общ. пл. кв. м	Инв. номер	Назначение	Адрес (номер дома)
Здание закрытой стоянки специавтоматизации и механизмов с АБК	2706,9	602/С-17926	Здание специализированное для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования	7
Составные части и принадлежности: навес, пристройка топочной на п/б «Дружный», тамбур, площадка, внутриплощадочные дорожки, ворота, забор				
Здание закрытой стоянки специавтоматизации и механизмов	1591,2	602/С-17925		7/2
Составные части и принадлежности: две пристройки, пристройка агрегатной на п/б «Дружный»				
Здание склада трансформаторной стали	5251,3	602/С-17924	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	7/1
Навес для хранения древесины	135	602/С-54176		7/3
Навес для хранения материалов на п/б «Дружный»	129,7	602/С-54177		7/4
Склад для хранения материалов на п/б «Дружный»	51,1	602/С-54178		7/5
Хозпитьевой и пожарный водопровод	441,5 м	602/С-55811	Сооружение специализированное коммунального хозяйства	
Составные части и принадлежности: количество трубопроводной арматуры – 6 шт., количество колодцев – 3 шт.				
Наружная канализационная сеть	678,07 м	602/С-55813		
Составные части и принадлежности: количество колодцев – 12 шт.				
Наружные теплосети	451,7 м	602/С-56336		
Составные части и принадлежности: количество трубопроводной арматуры – 19 шт., длина трубопровода – 969,30 м, количество колодцев – 1 шт., количество камер – 2 шт.				

Имущество, входящее в состав лота: внутриплощадочные сети электроснабжения (инв. № 1А), бытовой блок-модуль М-КЗ-3-06-ВОТ (3,0*2,5 м) (инв. № 95638), комплектно-трансформаторная подстанция (инв. № 61305), теплосчетчик SKU-02-B-AC (инв. № 99518), установка УВН-250 (инв. № 95770), измельчитель древесины Forus-HB 20 (инв. № 95484), установка УВН-250А (инв. № 10375), котел отопительный МИР-95 (инв. № 96787), транспортер ленточный с выдвижной секцией (инв. № 51190), кранбалка подвесная г/п 3.2 т (инв. № 51328), кранбалка подвесная г/п 3,2 т (инв. № 51329), кранбалка подвесная г/п 3,2 т (инв. № 51330), кранбалка г/п 3,2 тн. (инв. № 51404)

Сведения о земельных участках, предоставленных продавцу на праве постоянного пользования:
1) пл. **5,1494 га** для обслуживание производственных зданий и сооружений (ограничения (обременения) прав: охранные зоны линий связи и радиофикации, сетей и сооружений водоснабжения, канализации и теплоснабжения);
2) для обслуживания сетей теплоснабжения на промплощадке ТЭЦ-5 – пл. **0,0041 га, 0,0018 га, 0,0055 га** (ограничения (обременения) прав: охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения, территории перспективного развития населенных пунктов)

Начальная цена с НДС – 2 999 051,21 бел. руб.

Задаток 1 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**20.02.2019** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**19.02.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

В суд Оршанского района и г. Орши Витебской области поступило заявление о признании умершим Гаврилова Сергея Викторовича, 10.10.1969 года рождения, уроженца д. Новая Тухинь Дубровенского района Витебской области. Последнее известное место жительства: Витебская область, г. Орша, ул. Могилевская, д. 101, корп. 1, кв. 66.

Просьба к гражданам, располагающими какими-либо сведениями о Гаврилове С. В., сообщить их суду Оршанского района и г. Орши Витебской области в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества пансионата «Салтыковка», принадлежащего ОАО «Нафтан»

Лот № 1 состав: 1. Здание 1-этажное, литера А, площадь 210,7 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0000000:83897. 2. Здание нежилое, 3-эхтажное, литера Б, площадь 2156,7 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0000000:83903. 3. Здание (котельная), нежилое, литера Е, площадь 36,6 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0030107:48. 4. Здание, литера В-В1, площадь 62,1 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0000000:83894. 5. Скважина (артезианская) № 1, литера К. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0000000:83912. 6. Земельный участок для размещения пансионата, площадь 9 048,0 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0030107:2. 7. Земельный участок для размещения дома президента, площадь 718,0 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0030107:3. 8. Забор с воротами, литера 1-6. 9. Навес, литера Г, Г5. 10. Замощение, литера I-II. 11. Навес, литера Г2. 12. Беседка, литера Г3. 13. Бассейн, литера Г4. 14. Иное имущество, входящее в состав Лота № 1: движимое имущество (оборудование, мебель, хозяйственный инвентарь и т. д.), в том числе: основные средства в количестве 99 единиц, малоценные предметы в количестве 1200 единиц.
Местонахождение Лота № 1: Российская Федерация, Московская область, город Балашиха, микрорайон Салтыковка, ул. Профсоюзная, 12.
Начальная цена (без учета НДС) – 164 773 791,70 рос. руб. **Задаток** – 15 000 000,00 рос. руб. **Шаг аукциона** – 5 %.
Обременение: договор безвозмездного пользования имуществом

Аукцион состоится 28.02.2019 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток для **резидентов** Республики Беларусь перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Задаток для **нерезидентов** Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях BY57BLBB30120190055182001006, BIC банка BLBBBY2X, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр-т Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Нафтан», проводимом 28.02.2019. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Российской Федерации. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 26.02.2019 в 11.00. Контактные лица для осмотра Объекта аукциона: Гопко Владимир Иванович, тел. + 7 (916) 702-00-38, Жук Юрий Алексеевич, тел. + 7 (916) 471-31-39. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.11.2018

Организатор аукциона: +7 (495) 108-50-61, +375 (17) 324-70-57, +375 (29) 550-09-52, +375 (29) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении четвертых повторных публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок»

Дата и время проведения: 29.01.2019 г. в 11.00.
Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться с 09.00 18.01.2019 до 09.00 29.01.2019 г.

№ лота	Наименование	Инв. №	Год выпуска	Начальная цена, руб.,	Шаг аукциона, руб.	Размер задатка, руб.
1	Капитальное строение – пожарный водоем, площ. – 312 кв. м	110/С		5304,00	265,20	265,20
2	Капитальное строение – столовая и цех низковольтной аппаратуры, площ. – 6504 кв. м	110/С86817	1969	358200,00	17910,00	17910,00
3	Изолированные помещения неустановленного назначения (битумноперлитный цех), общ. площ. – 2294,4 кв. м	110/D-2776433	1975	48240,00	2412,00	2412,00

Продавец и организатор торгов: ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок», тел. +375163414964.
Ранее опубликованное извещение 28.12.2018 г. газета «Звязда».
Место проведения: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46, здание администрации.
Место нахождения предмета торгов: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46, зем. уч. № 141000000003000649.
Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий счет предприятия, с отметкой банка Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение десяти рабочих дней со дня их проведения.
Ознакомиться с предметами торгов можно по месту нахождения, предварительно согласовав дату и время с представителем продавца по тел. +375298091058.
По результатам торгов организатором торгов составляется протокол, подписываемый всеми участниками аукциона.
С победителем торгов продавцом в срок не позднее 25 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах торгов заключается договор купли-продажи. Приобретенный предмет торгов оплачивается участником, выигравшим торги не позднее 3 рабочих дней от даты заключения договора купли-продажи.
В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть подан этому участнику по цене, превышающей начальную на 5 % УНП 200240785

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже земельного участка

Наименование объекта	Лот № 1
Целевое назначение	установка детского кафетерия с детской игровой площадкой
Местонахождение объекта	г. Малорита, ул. Лермонтова
Продавец объекта	Малоритский районный исполнительный комитет
Организатор торгов	Малоритский районный исполнительный комитет
Начальная цена продажи, руб.	1668,12 (одна тысяча шестьсот шестьдесят восемь рублей 12 копеек)
Сумма задатка, руб.	166,81 (сто шестьдесят шесть рублей 81 копейка)
Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), кадастровый номер	0,0831 га; кадастровый номер 125250100001003339, решение Малоритского районного исполнительного комитета от 02.01.2019 № 16
Ограничения в использовании земельного участка	– охранная зона линий связи и радиофикации на площади 0,0002 га; – охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения на площади 0,0082 га
Вещное право, срок аренды земельного участка	Аренда, срок – 10 лет
Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, руб.	1886,86
Условия продажи	1. В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признании аукциона не состоявшимся; 1.1. Внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); 1.2. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в том числе на формирование земельного участка, государственной регистрации создания этого земельного участка. 2. В двухмесячный срок с даты проведения аукциона осуществить государственную регистрацию возникновения права на земельный участок и ограничений в использовании земельного участка в Малоритском бюро Кобринского филиала РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», г. Малорита, ул. Ленина, 9. 3. В установленном законодательством порядке разработать техническую документацию (проектно-сметную) на строительство объекта. 4. После получения разрешения на строительство объекта снять на земельном участке плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его для благоустройства придомовой территории. 5. Приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее срока, установленного законодательством

Аукцион состоится ***26 февраля 2019 года в 11.00*** по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1.
Контактные телефоны в г. Малорита: (8 01651) 2 28 03, 2 30 80, 2 30 01.
Для участия в аукционе представляются:
– заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с райисполкомом;
